ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 48 (4300)
Панядзелак, 29 лютага 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Аздараўленьне паравознай гаспадаркі — рашаючы вагар уздыму транспарту. Юр. Такарчук, Вол. Гарамін, Ул. Мяжэвіч — Паклёпы на завод (нарысы Янкі Скрыгана «Гомельмаш», «Маладняк») (2 стар.). — РУСАНОВІЧ. — Сацыялістычная рацыяналізацыя — важнейшы вагар унутрыпрамысловых накапленьняў (3 стар.).

Ільназагатоўчая кампанія недапушчальна зацягваецца. — Улічыць кожны кілёграм насеньня (1 стар.).

Сацыялістычнаму будаўніцтву — высокакваліфікаваныя кадры (1-я ўсебеларуская нарада па кадрах). — Аднаасобны сэктар недавыканаў яшчэ 21,7 проц. пляну збожжазагатовак. — Захаваньне і падрыхтоўку насеньня вясны — пад пэрсанальную адказнасьць (2 стар.).

Ва ўсесаюзны конкурс спараных брыгад уключаюцца часы ўдарніцкай транспарту. — Навігацыю 4-га заключнага году пяцігодкі сустрэць па ўсеўзбраеньні. — Партыйныя арганізацыі ўзначальваюць разгортваньне работы па сталінскім паходзе (3 стар.).

Польскія гарнякі трымаюцца стойка.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

Аздараўленьне паравознай гаспадаркі—рашаючы вагар уздыму транспарту

Народна-гаспадарчы плян бягучага году ставіць перад транспартам значна павышаныя патрабаваньні. Павінна быць перавезена 320 млн. тон грузаў, ці на 28 проц. больш, чым у мінулым годзе. Сярэднясутачны прабег таварнага паравоза павінен быць давядзен да 167 клм., а таварнага вагона—да 127 клм., сабекошт перавозак павінен быць зьніжан на 10 проц., нормы расходваньня апалу скарочаны на 9 проц. супроць 1931 г. Выкананьне гэтай праграмы патрабуе сапраўды бальшавіцкіх, ударных тэмпаў у рабоце, мабілізацыі ўвагі і сіл партарганізацый, усяго чыгуначнага пралетарыяту.

Як вядома, у першым квартале мінулага году дрэнная работа чыгунак мела значны ўплыў на недавыкананьне пляну па радзе галін народнай гаспадаркі, тармазіла фарсаваньне разьвіцьцё прамысловасьці. Гэтыя ўрокі —сур'ёзная перасьцярога. Транспарт не павінен больш зьяўляцца вузкім месцам усёй народнай гаспадаркі. Ён павінен сваячасова здавальняць патрабаваньні на перавозках на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Перабої ў рабоце транспарту у мінулую зіму ў асноўным тлумачацца дрэннай работай паравознага парку—вядучага і рашаючага зьвяна чыгуначнага транспарту. Адсюль тая вынятковая ўвага, якая патрабуецца барацьбе за здаровы паравоз.

Апошні ўчай барацьбе супроць пра[illegible]вых» апартуністаў, якія [illegible]ярмэзяць сацыялістычную рэканструкцыю транспарту, у выніку бальшавіцкага ажыцьцяўленьня пастаноў кастрычніцкага і сьнежаньскага пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, партыя дабілася раду перамог.

Пераход на спараную, **ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна** значна ўзьняў работу паравознага парку. Атрымаўшы пастаяннага гаспадара, паравоз узьняў якасьць і прадукцыйнасьць сваёй работы. Лепш за ўсё гэта відаць па стане паравозаў. Так, калі ў студзені 1931 г. хворых паравозаў па **Гомельскім** раёне было 40,7 проц., дык у студзені 1932 г.—16,6 проц., па **Жлобінскім** раёне у сакавіку 1931 г.—32,7 проц., а ў студзені 1932 г.—14,17 проц. У параўнаньні з мінулым годам ёсьць паніжэньне процанту хворых паравозаў і па **Віцебскім** і **Аршанскім** раёнах. Аднак, супроць заданай нормы па Віцебскім раёне ёсьць перавышэньне. У Віцебскім раёне паводле нормы ў студзені павінна было быць 11,5 проц. хворых паравозаў, а па справе іх было 16,56 проц. У другую дэкаду лютага замест 12,5 проц.—19,2 проц. Задача заключаецца ў тым, каб яшчэ больш **узмацніць барацьбу за аздараўленьне паравознай гаспадаркі**, за павышэньне эфэктыўнасьці работы паравозаў.

Трэба сказаць, што рад непармальнасьцяй, якія яшчэ ёсьць па транспарце, таксама як і высокі процант хворых паравозаў, у значнай меры тлумачыцца нізкай працоўнай дысцыплінай. Зрывы спаранай, спазьненьні цягнікоў, спыненьні ў дарозе, дрэнная **якасьць** рамонту і адсюль рост паўторнасьці яго—сур'ёзная перашкода далейшаму ўздыму работы транспарту. На чыгунках БССР у студзені было 450 здарэньняў. Толькі ў адным Гомельскім раёне былі 83 выпадкі зрыву спаранай язды. Асабліва адзначаецца нізкай працэсцыплінай Віцебскі раён, які наогул стаіць на апошнім месцы па выкананьні раду асноўных вымяральнікаў. За студзень месяц у Віцебскім раёне было 240 здарэньняў. За першую дэкаду лютага—101. У дэпо з-за нізкай якасьці рамонту было 225 выпадкаў паўторнасьцяй. Як відаць, чыгуначныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтага раёну не вядуць патрэбнай барацьбы за ўздым працоўнай дысцыпліны.

Тав. Ленін так ставіў пытаньне аб працдысцыпліне на чыгунцы: **«Калі ў прамысловасьці павінна быць жорсткая дысцыпліна, дык на транспарце яна павінна быць у два разы больш жорсткай па самой структуры транспарту».** Гэта ленінская фармулёўка павінна стаць штодзённым дзейсным лёзунгам кожнага чыгуначніка. Чыгуначныя арганізацыі павінны ўзьняць на барацьбу за жалезную, сацыялістычную працдысцыпліну ўсю пралетарскую грамадзкасьць.

Першы ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы на лепшую спараную брыгаду, якія скончыліся ў студзені, значна павысілі працдысцыпліну на паравозах, прынесьлі рад вытворчых перамог. Сотні машыністаў-ударнікаў паказалі сапраўдныя ўзоры барацьбы за здаровы паравоз, даказаўшы поўную магчымасьць лепшага скарыстаньня паравоза і яго аздараўленьня. Сацыялістычнае спаборніцтва, на аснове якога дасягнуты высокія паказальнікі—магутны вагар аздараўленьня транспарту, перамаганьня ўсіх труднасьцяй па гэтым шляху.

Замацаваць і пашырыць посьпехі першага конкурсу, каб узьняць барацьбу за здаровы паравоз на яшчэ вышэйшую ступень—важнейшая задача. Гэту мэту і ставіць перад сабой абвешчаны **газэтамі «Правда», «Гудок», НКШЗ і ЦК чыгуначнікаў другі ўсесаюзны конкурс імя XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі,** у якім будуць прымаць удзел 202 таварныя і 106 пасажырскіх паравозаў.

Заўтра старт лепшым паравозным брыгадам. Побач з 308 паравозамі па ўсесаюзным конкурсе ў спаборніцтва ўступаюць сотні спараных брыгад па дарожных, раённых і дэпоўскіх конкурсах. Абгаварэньне кандыдатаў усюды праходзіла пры вялікай актыўнасьці, якія яшчэ ёсьць па транспарце, таксама як і высокі процант хворых паравозаў, у значнай меры тлумачыцца нізкай працоўнай дысцыплінай. Зрывы спаранай, спазьненьні цягнікоў, спыненьні ў дарозе, дрэнная **якасьць** рамонту і адсюль рост паўторнасьці яго—сур'ёзная перашкода далейшаму ўздыму работы транспарту. На чыгунках БССР у студзені было 450 здарэньняў. Толькі ў адным Гомельскім раёне былі 83 выпадкі зрыву спаранай язды. Асабліва адзначаецца нізкай працдысцыплінай Віцебскі раён, які наогул стаіць на апошнім месцы па выкананьні раду асноўных вымяральнікаў. За студзень месяц у Віцебскім раёне было 240 здарэньняў. За першую дэкаду лютага—101. У дэпо з-за нізкай якасьці рамонту было 225 выпадкаў паўторнасьцяй. Як відаць, чыгуначныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтага раёну не вядуць патрэбнай барацьбы за ўздым працоўнай дысцыпліны.

Тав. Ленін так ставіў пытаньне аб працдысцыпліне на чыгунцы: **«Калі ў прамысловасьці павінна быць жорсткая дысцыпліна, дык на транспарце яна павінна быць у два разы больш жорсткай па самой структуры транспарту».** Гэта ленінская фармулёўка павінна стаць штодзённым дзейсным лёзунгам кожнага чыгуначніка. Чыгуначныя арганізацыі павінны ўзьняць на барацьбу за жалезную, сацыялістычную працдысцыпліну ўсю пралетарскую грамадзкасьць.

Першы ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы на лепшую спараную брыгаду, якія скончыліся ў студзені, значна павысілі працдысцыпліну на паравозах, прынесьлі рад вытворчых перамог. Сотні машыністаў-ударнікаў паказалі сапраўдныя ўзоры барацьбы за здаровы паравоз, даказаўшы поўную магчымасьць лепшага скарыстаньня паравоза і яго аздараўленьня. Сацыялістычнае спаборніцтва, на аснове якога дасягнуты высокія паказальнікі—магутны вагар аздараўленьня транспарту, перамаганьня ўсіх труднасьцяй па гэтым шляху.

Замацаваць і пашырыць посьпехі першага конкурсу, каб узьняць барацьбу за здаровы паравоз на яшчэ вышэйшую ступень—важнейшая задача. Гэту мэту і ставіць перад сабой абвешчаны **газэтамі «Правда», «Гудок», НКШЗ і ЦК чыгуначнікаў другі ўсесаюзны конкурс імя XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі,** у якім будуць прымаць удзел 202 таварныя і 106 пасажырскіх паравозаў.

Заўтра старт лепшым паравозным брыгадам. Побач з 308 паравозамі па ўсесаюзным конкурсе ў спаборніцтва ўступаюць сотні спараных брыгад па дарожных, раённых і дэпоўскіх конкурсах. Абгаварэньне кандыдатаў

Улічыць кожны кілёграм насеньня

Поўнасьцю ссыпаць у тэрмін і захаваць да вясны ў цэласьці насенныя фонды

Аб масавай праверцы работы па стварэньні насенных і страхавых фондаў, збожжаачыстцы гатунковым абмене і рамонце с.-г. машын

Пастанова прэзыдыуму ЦКК і калегіі НК РСІ

1. Адзначыць, што стварэньне насенных і страхавых фондаў па калгасах праходзіць зусім нездавальняюча: на 20 лютага плян выканан па насенных фондах на 47,9 проц., страхавых — на 30,7 проц. Ход рамонту трактараў і інш. с.-г. машын і прыпад таксама ні ў якай меры не забясьпечвае выкананьня пляну рамонту ў тэрмін — адрамантавана трактараў 40,3 проц., плугоў — 16 проц., сявярак — 31,3 проц., калёс — 8,4 проц.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што раённыя партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя органы большасьці раёнаў зусім не займаюцца падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі, і справа ідзе самацёкам.

Ня гледзячы на катэгарычнае папярэджаньне ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб тым, што «Ў 1932 ГОДЗЕ ПАСЕЎНЫЯ ПЛОШЧЫ Ў САЎГАСАХ І КАЛГАСАХ, А ТАКСАМА І АДНААСОБНІКАЎ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЦАЛКАМ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ З УЛАСНЫХ РЭСУРСАЎ», рад раёнаў—Бялыніцкі, Чашніцкі, Клічаўскі, Нараўлянскі, Чэрыкаўскі (10,3%), Жлобінскі (3,8%)—зусім не прыступілі да стварэньня насенных фондаў і не далі ніякіх вестак аб ходзе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі наогул.

Пасьпяховае выкананьне плянаў па стварэньні насенных фондаў Лепельскім (88 проц.), Полацкім (87 проц.), Чырвонапольскім (72 проц.), Мсьціслаўскім (88 проц.), Чырвона-Слабодзкім (91 проц.), Віцебскім (77 проц.), Шклоўскім (73 проц.), Дуброўенскім (75 проц.), Сіроцінскім (73 з [illegible] проц.) і Брагінскім (72 проц.) раёнаў паказвае, што пры сапраўды бальшавіцкай арганізацыі працы заданьне па стварэньні насенных і страхавых фондаў бязумоўна можа быць выканана.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум і калегія НК РСІ ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Даручыць райКК-РСІ, сумесна з РК КП(б)Б, арганізаваць на працягу з 1 па 10 сакавіка масавую суцэльную праверку ссыпкі насенных і страхавых фондаў, ходу рамонту трактараў і с.-г. машын.

Для праверкі стварыць праверачныя брыгады з рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, работнікаў раённых і цэнтральных устаноў, мабілізаваных на правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі; прыцягнуць прафсаюзы, камсамол, лёгкую кавалерыю раённых і нізавых друк — шырока выкарыстаць мэтад праверкі калгасаў і саўгасаў, ня скончыўшых стварэньня насенных фондаў, рамонт інвэнтару тымі калгасамі і саўгасамі, якія гэту работу ўжо скончылі. Непасрэднае кіраўніцтва праверкай ускладаецца на старшынь гарадзкіх і раённых КК-РСІ.

2. Даручыць НКЗ, Белкалгасцэнтру і Трактарацэнтру па сваёй лініі даць указаньне падпарадкаваным установам і камандыраваным у раён работнікам аб уключэньні ў праверку.

3. Прасіць культпроп ЦК КП(б)Б даць дырэктыву рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт аб уключэньні ў праверку, якая праводзіцца.

4. Праверку стварэньня насенных і страхавых фондаў, рамонт трактараў і с.-г. машын увязаць з арганізацыйнымі мерапрыемствамі, якія забясьпечваюць карэнны пералом у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, у прыватнасьці:

а) арганізаваць ссыпку насенных і страхавых фондаў у размерах, якія забясьпечваюць поўнае выкананьне пасеўных плянаў, да тэрміну, на аснове высоўваньня зьнізу сустрэчных тэрмінаў;

б) арганізаваць сацыялістычную пазыку насеньня з боку тых калгасаў, якія маюць лішкі насеньня, тым калгасам, якія ўласным насеньнем не забясьпечаны, разгарнуць шырокую масава растлумачальную работу сярод калгасьнікаў па ўдзеле іх у сацыялістычнай пазыцы за кошт іх уласных рэсурсаў.

в) нападзіць дакладны ўлік падлягаючых рамонту с.-г. машын і збруі, арганізаваць дастаўку іх у майстэрні для рамонту з такім разьлікам, каб рабочыя майстэрань былі поўнасьцю загружаны работай па рамонце і каб да 15 сакавіка г.г. рамонт быў цалкам скончан;

г) прасычыць за тым, каб рамонтныя матар'ялы і запасныя часткі, выдаўленыя ў часе праверкі, былі цалкам скарыстаны па прызначэньні;

д) вылучыць у кожным калгасе пэрсанальна адказных асоб за стварэньне насенных і страхавых фондаў, ачыстку насеньня і г. д.

Праверыць выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б аб вылучэньні такіх асоб у раённых савецкіх і зямельна-калгасных органах.

5. Абавязаць райКК-РСІ даслаць у ЦКК-НК РСІ інфармацыйныя зводкі аб ходзе і выніках праверкі ў наступныя тэрміны: першая зводка — 6 сакавіка, Другая — 10 сакавіка і агульныя вынікі — 13 сакавіка. Зводкі павінны дасылацца кожны раз пасьля папярэдняга абмеркаваньня іх на пасяджэньнях прэзыдыуму райвыканкому, райКК-РСІ і бюро РК КП(б)Б.

У далейшым устанавіць рэгулярную дасылку ў ЦКК-НК РСІ інфармацыйных лістоў 1, 10 і 30 кожнага месяца аб ходзе падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі.

Даручыць с.-г. групе даць адпаведныя ўказаньні аб парадку складаньня гэтых лістоў.

6. Абавязаць райКК-РСІ вылучыць са свайго складу адказнага за падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі; праз кантрольныя пасты ў калгасах і саўгасах, сэкцыі РСІ пры сельсаветах арганізаваць пастаянны кантроль і рэгулярную інфармацыю аб ходзе збору насенных фондаў і рамонце трактараў і с.-г. інвэнтару, рэалізацыі мінэральных угнаеньняў з тым, каб кожная райКК-РСІ штодзенна была ў курсе справы адносна кожнага сельсавету, калгасу і саўгасу ў паасобку і магла-б прымаць неадкладныя меры па ўзмацненьні тэмпаў работы.

7. ЦКК-НК РСІ ўказвае ўсім раённым партыйным, савецкім і зямельна-калгасным органам, што рашаючым сродкам у іх руках для пасьпяховага выкананьня збору насенных і страхавых фондаў, рамонту трактароў, машын, рэалізацыі ўгнаеньняў і інш. падрыхтоўчых работ да пасеўнай кампаніі зьяўляецца найшырэйшая папулярызацыя пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб зборы калгасных насенных фондаў, неадкладнае правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага, пастановы ЦК КП(б)Б аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва вакол пытаньняў падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі як унутры калгасаў, так і паміж калгасамі і раёнамі.

Старшыня ЦКК КП(б)Б — Нарков
РСІ Бел. КАЛНІН.



РАМАНТУЮЦЬ ТРАКТАР

Пробны выезд паказаў поўную гатоўнасьць да сустрэчы вясны

ЛЕПЕЛЬ. Калгас «Шлях сацыялізму», Кашчынскага сельсавету, зьяўляецца адным з буйнейшых калгасаў раёну, які сваячасова распачаў падрыхтоўку да 3-яй бальшавіцкай вясны.

Канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва з боку праўленьня калгасу, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод брыгад і паміж паасобных калгасьнікаў, занятых на рамонце інвэнтару, вупражы, ачыстцы насеньня, далі станоўчыя вынікі. 21-га лютага калгас зрабіў пробны выезд у поле. Пробны выезд паказаў, што калгасы знаходзяцца ў поўнай гатоўнасьці: 34 трактарныя і 25 аднаконных плугоў, інвэнтар, вупраж уже поўнасьцю адрамантаваны. Засыпаны страхавыя і насенныя фонды згодна данага пляну.

Арганізаваны брыгады, да якіх прымацаваны коні, вупраж, інвэнтар і вызначаны вучасткі работы.

Лепш за ўсіх паказалі сваю гатоўнасьць да сустрэчы вясны аддзяленні калгасу «Пасыскае» і «Агурэцкае», якія на 100 проц. удзельнічалі ў пробным выезьдзе з добра адрамантаваным інвэнтаром і вупражжу.

15 лепшых ударнікаў праявіўшых сабе падрыхтоўцы прэміяваны.

А. Налётны.

Заводы, рыхтуйцеся да бальшавіцкай вясны!

ВЫПУСК БАРОН І БАЛОТНЫХ ПЛУГОЎ НЕ НАЛАДЖАН

ВІЦЕБСК.

Цэнтральная ўвага кіраўніцтва заводамі сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва павінна быць зараз накіравана на падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Аднак, на заводзе «Чырвоны мэталіст» належнай увагі да падрыхтоўкі не адчуваецца. Яшчэ й дагэтуль не наладжан выпуск барон «Зіг-Заг» і балотных плугоў «Эброгард».

У той час, як у лютым штодзённы выпуск барон «Зіг-Заг» павінен складаць 438 штук, з тым, каб ліквідаваць прабелы за студзень, 17 лютага выпушчана 285 штук, 18-га — 246; 19-га — 102 штукі і г. д. Асноўная прычына недавыкананьня пляну ў тым, што адна коваччая машына, якая ёсьць, пры трохзьменнай рабоце і бесперапыцы, можа даць ня больш 8.000 зубоў, між тым, для выпуску патрэбнай колькасьці барон штодзённа неабходна мець 9.000 зубоў. Гэты недахоп можна было-б ужо даўно ліквідаваць шляхам прыстасаваньня да вырабу зубоў коваччна - гвазьдзільнай машыны, якая не скарыстоўваецца ча працягу двух год, але чамусьці адміністрацыя заводу пачала клапаціцца аб гэтым зусім нядаўна.

Апрача таго, балтарэзкі, якія тарэзаюць зубі з прычыны свайй эпонтаннасьці, даюць шмат браку. У гэтым зінават мэтанік заводу тав. **Шкуберт,** які не падумаў аб своячасовым рамонце балтарэзак, хаця апошнія на працягу 8 месяцаў не былі нагружаны работай.

Перашкаджае выпуску барон «Зіг-Заг» і рамонтны цэх, які замест таго, каб паправіць аўтамат для запрубоўваньня гаек у 4-5 гадзін, трымае яго на працягу 3 дзён.

Плугі «Эброгард», якія завод пачаў выпускаць, не рабіліся ўвесь час з-за адсутнасьці сталёвага ліцьця. Нядаўна ліцьцё было атрымана, але зьявіўся новы тормаз — загадчык такарнага цэху тав. **Сяргеенка** не давымеркаваў правільна абточку дэталяй. У выніку—да сярэдзіны лютага ні адзін комплект дэталяй на зборку не паступіў.

Адміністрацыйна - тэхнічны персанал заводу павінен неадкладна ліквідаваць усе адзначаныя недахопы і забясьпечыць поўнае выкананьне праграмы сельска - гаспадарчага машынабудаўніцтва.

Арк. Зарубежны, Піміцтэйн, Пайцін.

Ільназагатоўчая кампанія недапушчальна зацягваецца

Неадкладна дабіцца рэзкага ўздыму ўверх крывой загатовак—баявая задача ўсіх партарганізацый

Ня згортваць ільназагатовак

Апошняя ныцідненька дала прырост усяго на 0,6 проц. Рэспубліканскі плян на 26 лютага выкананы на 56,1 проц.

Па сэктарох заданьні рэалізаваны наступным чынам: калгасы МТС—58,3 проц., іншыя калгасы 79,8 проц. аднаасобны сэктар 38,9 проц.

Такім чынам, калгасны сэктар, асабліва калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, усё яшчэ не ўяўлі належных тэмпаў і не пераключыўся па хутчэйшае завяршэньне ільназагатовак.

Па-ранейшаму найбольш адстаючым вучасткам зьяўляецца аднаасобны сэктар. У радзе сельсаветаў кулацка-заможныя гаспадаркі, не адчуваючы націску, злосна зрываюць здачу ільнавалакна. У Крупскім раёне за 20 дзён па значнай частцы сельсаветаў у кулацка - заможных гаспадарак не прынята ні воднага кілёграма валакна. Ухіляючыся і зрываючы загатоўкі, кулак вяце шалёную агітацыю сярод адсталых калгасьнікаў за разбазарваньне і ацэньмеркаваньне ільну паміж паасобнымі гаспадаркамі. У некаторых сельсаветах Дубровенскага раёну разбазарваньне ільну «на ўласныя патрэбы» набыло масавы характар.

З паасобных раёнаў, нават ільнарочных (Дуброўна) паведамляюць, што ільназагатоўкі за апошнія дні фактычна згарнуліся.

Дэмабілізацыйныя настроі, калькуляцкія тэндэнцыі, безадказнасьць, ігнараваньне масавай работы сярод калгасьнікаў і бедняковых і серадняковых—аднаасобнікаў з боку многіх мясцовых арганізацый, асабліва загатоўчых — вось прычыны мізэрных паказальнікаў выкананьня пляну.

Па дэмабілізацыйных настроях павінен быць нанесен сакрушальны ўдар. Адной з важнейшых мерак, па якіх партыя будзе ацэньваць работу кожнай партарганізацыі, яе кіраўніцтва, калгасу, сельсавету зьяўляецца поўнае і сваячасовае выкананьне пляну ільназагатовак.

Баявая задача ўсіх партыйных, камсамольскіх, загатоўчых арганізацый — мабілізаваць на кутчэйшае завяршэньне ільназагатоўчай кампаніі, увязваючы яе з падрыхтоўкай да трэцяй бальшавіцкай вясны і арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.

Правільная расстаноўка сіл і арганізацыя работы па пераапрацоўцы, мабілізацыя калгаснай грамадзкасьці, вясковага актыву, бязьлітасная барацьба з кулацка - рвацкімі тэндэнцыямі, арганізацыя бужэру адстаючым забясьпечаць посьпех кампаніі.

Калгас „Чырвоны сьцяг" перавыканаў плян

МАГІЛЕЎ.

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», ВЕНДАРСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПАКАЗАЎ УЗОРЫ БАРАЦЬБЫ ЗА СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ СВАІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ. КАЛГАС ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧЫЎ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНАВАЛАКНА. ЗАМЕСТ 7,6 ЦЭНТ. ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ, «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» ЗДАЎ 10,5 ЦЭНТ.

ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ БЫЛІ ДАСЯГНУТЫ Ў ВЫНІКУ РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА ІЛЬНААПРАЦОЎЧЫМ ПУНКЦЕ І МАБІЛІЗАЦЫІ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАСЬПЯХОВАЕ ЗАВЯРШЭНЬНЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

АСАБЛІВА ЎДАРНА ПРАЦАВАЛА БРЫГАДА КАМСАМОЛЬЦА ФІЛІМОНАВА П. БРЫГАДА ШТОДЗЕННА ПЕРАВЫКОНВАЛА НОРМЫ.

СКОНЧЫЎШЫ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ, КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» ПЕРАКЛЮЧЫЎСЯ НА ЎДАРНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ТРЭЦЯЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ.

«К. М.».

По дэмабілізацыйных настроях—зьнішчальны ўдар

Тэмпы ільназагатовак па Дубровенскім раёне зьнізіліся. Апошнія пяцідноўкі даюць ня больш 0,5 проц. прыросту. Сярод загатоўчых арганізацый, паасобных сельсаветаў і работнікаў пануюць дэмабілізацыйныя настроі «усё роўна пляну загатовак ня выканаем» (райкаапільнасаюз, Баеўскі сельсавет).

Лядзянскі і Красноўскі загатоўчыя пункты зусім спынілі загатоўчую работу. Аслаблена апэрацыйнае кіраўніцтва загатоўкамі з боку Баеўскага, Снаташыцкага і Слатаўскага сельсаветаў. Выкананьне кантрактацыйных дагавораў не правяраецца.

Аднэй з асноўных прычын ганебнага адставаньня Селявіцкага, Слатаўскага і Савінскага сельсаветаў — асяданьне ільну на «ўнутры-гаспадарчыя патрэбы». У радзе выпадкаў лён выкарыстоўваецца на лапці, вяроўкі і г. д. Па асобных сельсаветах выяўлены факты шкодніцкага зьнішчэньня трасты. У Славінскім і Слатаўскім сельсаветах трастой і ільнасаломай крыюцца стрэхі. У калгасах Іскоскага сельсавету валакно самых высокіх нумароў разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі. **(БЕЛТА).**

Разгрузіць койданаўскую ільнабазу

КОЙДАНАВА (Па тэлефону)

На ільнабазе **Койданаўскай** райзагатканторы і на складзе **МТС** ляжаць два вагоны апрацаванага і адсартаванага ільну і два з паловай вагоны неапрацаванага валакна.

Райзагаткантора ня ведае куды адпраўляць лён. Менская ільнабаза накант гэтага дае пярэчлівыя ўказаньні.

Трэба выявіць вінаватых у залежах валакна на базе і прыцягнуць да адказнасьці. Лён павінен быць неадкладна адпраўлен з баз на тэкстыльныя фабрыкі.

Калектыўны карэспандэнт «Зьвязды»:

Рэмаслы «Ударнік Койданаўчыны».

10 вагонаў угнаеньня валяюцца на ст. Смалявічы

Менск, Наркамзем, Лінейнаму пракурору і рэдакцыі „Зьвязда"

На станцыі Смалявічы з жніўня месяца 1931 г. ляжыць упшаеньне ў колькасьці 10 вагонаў. З іх тры адрасованы саўгасу «Вызваленьне», два—Чэрвенскаму райкаапсаюзу і 5 — Тагайскаму райкаапсаюзу. Маючы па ўвазе разгорнутую кампанію падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, прашу ўзьдзейнічаць на атрымальнікаў грузу, каб яны неадкладна вывезьлі ўчнаеньне.

НРЗ — Панамароў.

80 чал. на ліквідацыю адставаньня

КЛІЧАЎ, (Наш спэцкор.).

Загатоўкі насеньня тэхнічных культур і гародніны па Клічаўскім раёне праходзіць зусім нездавальняюча. На 20 лютага плян загатовак вікі выкапан на 36 проц., канюшыны — 0,4 проц., цімафеўкі — 0,2 проц. Такія самыя паказальнікі па загатоўках насеньня і гародных культур.

Ссыпка насенных і страхавых фондаў таксама праходзіць марудна. Для ўзмацненьня тэмпаў загатовак насеньня, культурных траў і ссыпкі насенных і страхавых фондаў РК КП(б)Б накіраваў у сельсаветы і калгасы 80 чал. раённага актыву.

А.

Сухое пратручваньне насеньня збожжавых—важнейшы сродак барацьбы з хваробамі расьлін

Па - баявому сустрэць сяўбу і атрымаць высокі ўраджай — гэта значыць у першую чаргу трэба сабраць у патрэбным размеры і добрай якасьці насеньне і ў тэрміны, устаноўленыя пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Нароўні з іншымі агрэмерапрыемствамі, накіраванымі на паляпшэньне якасьці насеньня , як ачыстка і сартаваньне, адбор ці селекцыя, зьяўляецца барацьба з пустазельлем, шкодніками і хваробамі сельска-гаспадарчых расьлін.

Аднэй з самых пашыраных хвароб, ад якое часта гіне каля паловы ўраджаю, а часамі і больш усіх збожжавых культур, зьяўляецца ўсім вядомая галаўня ці «сажа». Гэта хвароба вельмі заразьлівая і ёю хварэюць усе збожжавыя культуры, асабліва пшаніца, ячмень, авёс і проса. Прычынай гэтай хваробы зьяўляецца грыбок - чужаед, які, нападаючы на расьліну, жывіцца не соками. Ня ўсе гатункі с. - г. расьлін могуць аднолькава хварэць гэтай хваробай: адны хварэюць слаба, другія моцна. Адсюль вынікае, што ўстойлівасьць гатункаў расьлін супроць гэтай хваробы мае вялікае значэньне для сельскай гаспадаркі. На падбор устойлівых гатункаў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Асноўнай крыніцай пашырэньня галаўні зьяўляецца засьмечаны яе зародзікамі насенны матар'ял. Таму пры змаганьні з галаўнёй павінна быць зьвернута ўвага на зьнішчэньне гэтых зародзікаў у насеньні.

У мінулым годзе сельска- гаспадарчымі арганізацыямі і аддзелам Бел-АБШ на барацьбу з галаўнёй зусім мала было зьвернута ўвагі, і практычная работа амаль была сарвана. Слаба разгорнута гэта работа і ў сучасны момант. Ёсьць пагроза зрыву пляну барацьбы з гэтай хваробай і сёлета, выключна з-за недаацэнкі гэтай справы паасобнымі сельска-гаспадарчымі ўстановамі.

Ёсьць шмат простых спосабаў барацьбы з галаўнёй, як мокрае пратручваньне насеньня ў растворах з вадою атруты: меднага купарвасу, фармаліну і інш. Але гэтыя спосабы патрэбна ўжываць перад самым пасевам за дзень, за два, што не заўсёды можна зрабіць. У гэтых спосабах ёсьць недахопы: 1) зьяўляецца ўсхожасьць насеньня ад 2-5 проц. і больш; 2) пратручанае насеньне трэба прасушваць, для чаго патрэбна шмат часу.

За апошнія гады навукай знойдзены новыя спосабы зьнішчэньня галаўні ў насеньні праз апыльваньне ці сухое пратручваньне ў медным купарвасе і інш. Сухое пратручваньне робіцца вельмі проста. Для гэтай мэты трэба знайсьці бочку, або якую-небудзь пасудзіну, якая-б шчыльна зачынялася з усіх бакоў і з пакрыўкаю ў дне. Гэту бочку, або пасудзіну трэба прыстасаваць так, каб яна круцілася на восях паміж дзьвёх стоек накшталт маслабойкі. У пасудзіну насыпаюць належную колькасьць насеньня і адпаведную дозу парашка атруты. Зачыніўшы пакрыўку, пасудзіну круцяць на працягу 5-10 хвілін, каб добра перамяшаць насеньне з атрутаю.

Дасьледчыя даныя па апылкаваньні насеньня супроць галаўні як замежных дзяржаў, так і Савецкага Саюзу даюць нам поўную падставу рэкамэндаваць апылкаваньне (сухое пратручваньне). На падставе ўгрунтаваных дасьледаў пашых навуковых устаноў раіцца ўжываць для апылкаваньня наступныя парашкі-атруты: парыскую зеляніну, парашок АБ і абязводжаны медны купарвас. На кожныя 16 кілёграм насеньня бярэцца 20 грам адпаго з пакаваных відаў атруты. Пасьля апылкаваньня (сухога пратручваньня) мокрага пратручваньня не патрабуецца.

Апылкаванае насеньне павінна хавацца асобна ад харчавога збожжа з мэтай перасьцярогі, каб яно не папала на харчаваньне людзям і жывёле.

Каб пазьбегнуць зараджэньне зерня праз тару, с. - г. інвэнтар і насеннахавальнікі, неабходна зрабіць паіярэдняю дэзынфэкцыю іх фармалінам, або іншымі атрутамі, якія зьнішчаюць галаўню.

Сухое пратручваньне насеньня збожжавых—важнейшы сродак барацьбы з хваробамі расьлін

Для перасьцярогі паўторнага заражэньня зерня пры збожжаачыстцы неабходна апылкаваньне рабіць адразу пасьля ачысткі і ўстанаўленьня прыгоднасьці насеньня для пасеву.

Пры масавым апылкаваньні, працуючы без тэхнічных прыстасаваньняў, трэба сьцерагчыся ад распыленьня парашкоў атруты ў паветры, каб уберагчы сябе ад пылу, які раздражняе сьлізістыя абалонкі роту і носу.

У мэтах эфэктыўнасьці апылкаваньня трэба падрыхтаваць рабочыя брыгады па апылкаваньні ў саўгасах, МТС і калгасах.

Камсамол і ячэйкі Асоавіяхіму павінны стаць ініцыятарамі ў гэтай справе.

Ні адно кілё насеньня збожжавых культур не павінна застацца не апылкаваным.

Наркамзему, Калгасцэнтру неабходна прыняць меры і забясьпечыць саўгасы і калгасы сродкамі барацьбы з галаўнёй і іншымі хваробамі сельска-гаспадарчых расьлін, выдаўшы адпаведную інструкцыю.

Скарыстаўшы вопыт, набыты ў м

ПЕРШАЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА КАДРАХ

САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ—ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫЯ КАДРЫ

З дакладу тав. Кухаркіна

— Беларусь да Кастрычніцкай рэвалюцыі, — гаворыць тав. **Кухаркін**, — была адной з самых адсталых акраін царскай імперыі. Зараз БССР з посьпехам **завяршае ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня за чатырохгодку і** прыступае да ажыцьцяўленьня **ўсенавучу на базе 7-мі гадовай школы.** Гэта дае нам магчымасьць больш шырока разгарнуць барацьбу за аўладаньне тэхнікай як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Кожнаму зразумела, што нельга аўладаць тэхнікай **без элемэнтарнай пісьменнасьці.**

Дакладчык падрабязна спыняецца на задачах, якія стаяць перад партыйнымі арганізацыямі і савецкай грамадзкасьцю ў галіне барацьбы за аўладаньне тэхнікай.

Тав. Кухаркін падкрэсьлівае, што XVI зьезд УсеКП(б) у сваіх пастановах вельмі ясна паказаў аб тым, што зараз «рашаючае значэньне мае пастаўленая ЦК па ўвесь рост **праблема кіруючых, гаспадарчых і тэхнічных кадраў, якая становіцца цэнтральнай праблемай нашага сацыялістычнага будаўніцтва.** Толькі пры далейшай мабілізацыі сіл усёй партыі і рабочай клясы вакол задачы падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочай клясы, толькі пры рашучым зруху ў гэтым напрамку можа быць забясьпечана далейшае правядзеньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны».

Нашы ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы, фабзавучы і г. д. вырасьлі ня толькі колькасна, але і якасна. У навучальных установах значна **ўзрасла пралетарская і партыйная праслойка.** Мы палепшылі сыстэму падрыхтоўкі патрэбных нам савецкіх спэцыялістаў. Мы рэарганізавалі сетку сельска-гаспадарчых ВНУ, дабіліся вялізарных посьпехаў у арганізацыі ВТНУ, якія непасрэдна рыхтуюць кадры для нашай узрастаючай прамысловасьці.

Затым дакладчык адзначае, што яшчэ далёка ня ўсё зроблена па далейшым паляпшэньні сыстэмы падрыхтоўкі кадраў па распрацоўцы і ўдасканаленьні профілю спэцыяліста. У гэтым кірунку ёсьць яшчэ шмат блытаніны. Ёсьць такія ВНУ, факультэты, тэхнікумы, у якіх да апошняга часу няма поўнага вычарпальнага разуменьня аб падрыхтоўцы спэцыяліста, няма распрацаванага профілю.

Гаспадарчыя арганізацыі, у веданьні якіх знаходзяцца навучальныя ўстановы, якія непасрэдна рыхтуюць кадры спэцыялістаў для іх, вельмі часта не праяўляюць патрэбнай зацікаўленасьці работай ВНУ, або тэхнікуму, не дапамагаюць гэтай навучальнай установе рыхтаваць высокакаэкаснага і высокакваліфікаванага работніка. Больш таго, мы маем факты, калі некаторыя цэнтральныя гаспадарчыя арганізацыі ня вецаюць, колькі ім патрэбна спэцыялістаў, ды маюць балянсу патрэбных кадраў.

Ня гледзячы на вялізарны рост сеткі навучальных устаноў, рост іх прадукцыі, зразумела, што ў рамках бюджэтных асыгнаваньняў мы ня здолеем падрыхтаваць тэй колькасьці спэцыялістаў, кадраў, якія патрэбны для сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, якія патрэбны нашай узрастаючай індустрыі і сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі.

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, змагаючыся за рэканструкцыю народнай гаспадаркі, будуючы бясклясавае грамадзтва, аўладоўваючы сучаснай навейшай тэхнікай, у працэсе работы **ВЫСОЎВАЕ** дзесяткі і сотні тысяч да канца адданых справе сацыялізму рабочых, арганізатараў вытворчасьці, вынаходцаў, практыкаў і г. д. Нашы задачы заключаюцца ў тым, **каб выявіць гэтых перадавікоў, дапамагчы рабочым брыгадзірам, вынаходцам, ударнікам аўладаць тэхнікай сваёй справы, каб сьмела вылучаць іх на кіруючыя пасады.**

Гэта адносіцца ня толькі да прамысловасьці, але ў такой-жа меры і да сельскай гаспадаркі.

Далей тав. Кухаркін спэцыяльна спыняецца на задачах падрыхтоўкі калгасных кадраў. У гэтым годзе павінна быць падрыхтавана **100 тысяч** чалавек калгасьнікаў і сельска-гаспадарчых рабочых для кіраўніцтва і для работы на калгасных і саўгасных вытворчасьці. Дакладчык канстатуе, што ў справе падрыхтоўкі гэтай вялізарнай арміі наглядаецца вялікая павольнасьць з боку раду партарганізацый. Да гэтага часу падрыхтавана толькі 6.000 чалавек і занята на розных курсах ня больш 20.000 чалавек. Такім чынам з патрэбнага яку падрыхтаваны і рыхтуюцца толькі адна чацьвёртая частка.

— Воснавая сяўба не за гарамі. Да пачатку сяўбы мы павінны падрыхтаваць гэту стотысячную армію брыгадзіраў, кіраўнікоў, паляводаў, трактарыстаў і г. д. Тут марудзіць нельга.

Далей дакладчык аналізуе прычыны «ўтрускі» калгасных кадраў, якія былі падрыхтаваны ў мінулым годзе. Справа ў тым, што ў раёнах, дый у цэнтральных установах літаральна няма ніякага ўліку падрыхтаваных кадраў, уліку іх скарыстаньня, няма вывучэньня людзей — гэтай неабходнай умовы забясьпячэньня посьпеху ў вырашэньні праблемы кадраў.

Тав. Кухаркін прыводзіць дзесяткі фактаў і шматлікія лічбы, якія сьведчаць аб вялізарнай цякучасьці кадраў як кіраўнічых, так і гаспадарчых, і савецкіх у раённым і цэнтральным апараце. Прычыны цякучасьці заключаюцца, перш за ўсё, у невыкананьні 6 умоў тав. Сталіна, у невыстарчальнай рэалізацыі партыйных дырэктыў аб беражлівых адносінах да спэцыялістаў, аб вывучэньні іх і складаньні для іх неабходных умоў у рабоце. **З цякучасьцю трэба самым рашучым парадкам змагацца і, перш за ўсё, з тымі, хто стварае гэту цякучасьць.**

У заключэньне тав. Кухаркін падкрэсьлівае, што праблема кадраў вырашаецца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы, што ў падрыхтоўцы кадраў ня можа быць ніякага самацёку. У паасобных мясцох яшчэ да гэтага часу захаваліся думкі, што праблема кадраў вырашаецца сама па сабе бяз упартай, жорсткай і настойлівай работы. Так думаць і працаваць могуць толькі заядлы апартуністы. Партыя вырашае і вырашыць праблему кадраў у бязьлітаснай барацьбе з апартуністамі ўсіх масьцей, шляхам упартай, штодзённай барацьбы.

З дакладу т. Шапіра

Потым нарада заслухала даклад тав. **Шапіра** аб кантрольных лічбах на падрыхтоўцы кадраў на 1932 год.

— У 1932 годзе мы ў БССР упіраем у прамысловасьць каля **90 тыс.** ковых рабочых, павялічваем прамысловую прадукцыю больш чым на **50 проц., падвойваем пасеўную плошчу калгасаў і** больш чым **патройваем сьвіное стада саўгасаў.** Размахі будаўніцтва, — гаворыць тав. Шапіра, — у другой пяцігодцы будуць яшчэ больш грандыёзнымі. Мы павінны будзем нашу прамысловую прадукцыю павялічыць **у 3½-4 разы,** прадукцыю тэхнічных культур — **у 2½-3 разы** і агульнае сьвіное стада ў 1½-2 разы. У другой пяцігодцы ў нас асабліва будзе бурна расьці жыльлёва-камунальнае будаўніцтва, культурна-бытавое абслугоўваньне і асабліва культурнае будаўніцтва.

Бясспрэчна, што гэта ўсё павышае патрабаваньні да кадраў, вымагае большай падрыхтоўкі спэцыялістаў вышэйшай, сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі і масавай кваліфікаванай рабочай сілы.

XVI партыйны зьезд пры зацьвярджэньні першай пяцігодкі падкрэсьліў, што прадпасылкай выкананьня пяцігодкі зьяўляецца **вырашэньне праблемы кадраў.** Кожнаму з нас вядома, што Беларусь у мінулым ня мела пішчай вышэйшай школы, а зараз мы іх маем 26, 88 тэхнікумаў, 234 фабзавучы, шмат розных курсаў і г. д.

На 1932 год намячаецца далейшае, яшчэ больш шпаркае разгортваньне сеткі навучальных установ на падрыхтоўцы кадраў. У 1932 годзе — апошнім годзе першай пяцігодкі — будзе ўкладзена **11 млн. руб.** у справу падрыхтоўкі кадраў. Гэтыя сродкі ў першую чаргу будуць патрачаны па пабудову вучэбных карпусоў, інтэрнатаў, стандартных дамоў, на набыцьцё абсталяваньня. Для нас зусім зразумела, што гэтыя ўкладаньні будуць спрыяць пашырэньню падрыхтоўкі кадраў таму, што ня толькі кожны вучэбны корпус, але кожны новы стандартны дом, новы вучэбны пакой ствараюць прадпасылкі **для яшчэ большага пашырэньня справы падрыхтоўкі кадраў.**

Рабфакі ў 1932 годзе павінны ўзрасьці на 173 проц. На 1-1 33 г. рабфакамі павінна быць ахоплена **16½ тысяч чалавек, тэхнікумамі — 31½ тысяч** чалавек і г. д. Ахоп студэнцтва ВНУ ў гэтым годзе ўзрасьце на **180 проц.** і фабзавучамі — на **323 проц.** У агульнай сыстэме падрыхтоўкі кадраў значную ролю адыгрываюць вячэрнія заняткі, якімі будзе ахоплена некалькі тысяч чалавек. Адначасова ня кіруецца значнае разгортваньне сеткі завочнага навучаньня.

Другая пяцігодка павінна будзе ў поўнай меры, — падкрэсьлівае тав. Шапіра, — пажынаць плёны работы, праведзенай у першай пяцігодцы. Але гэта ня значыць, што мы аслабім у другой пяцігодцы работу па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў.

Тав. **Сталін** у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў сказаў, што вытворча-тэхнічная інтэлігенцыя рабочай клясы будзе фармавацца ня толькі з людзей, прайшоўшых вышэйшую школу, але яна будзе рэкруатавацца з практыкаў, работнікаў нашых прадпрыемстваў, з кваліфікаваных рабочых, з культурных сіл рабочай клясы на фабрыках, заводах, капальнях і з ініцыятараў сацыялістычнага спаборніцтва, павадыроў ударных брыгад. Задача заключаецца ў тым, каб сьмялей вылучаць на камандныя пасады людзей з асяродзішча рабочай клясы, сапраўды адданых барацьбе за сацыялізм, ударнікаў, вынаходцаў, практыкаў і г. д.

Рэалізуючы лёзунг аб аўладаньні тэхнікай, мы павінны атрымаць магчымасьць ліквідаваць дэфіцыт ў кадрах. Трэба памятаць, што XVII партыйная канфэрэнцыя ўказала на тое, што толькі пры мабілізацыі ўсіх сіл партыі і рабочай клясы вакол задачы падрыхтоўкі кадраў, толькі пры рашучым зруху ў гэтай галіне можа быць забясьпечана далейшае нарастаньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У рэзалюцыі па дакладу тав. **Арджанікідзэ** сказана, што вышэйшы інжынэрна-тэхнічны склад **павінен быць** на вышыні сучаснай сусьветнай тэхнікі **і поўнага веданьня спэцыфічных умоў нашай гаспадаркі.** Тэарытычнае навучаньне ў ВНУ павінна суправаджацца практычным вопытам на прадпрыемствах. Гэта і вызначае, што мы павінны патрабаваць ад спэцыяліста поўнага практычнага падыходу і стварэньня такіх спэцыялістаў, якія былі-б сапраўды **на ўзроўні грандыёзнага этапу,** у які мы ўступілі, этапу, які характарызуецца лёзунгам «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краіны.

Трэба памятаць, што нашы спэцыялісты не павінны ператварацца ў чыноўніцкую фігуру вузкага спэцыяліста, што наш **спэцыяліст павінен быць змагаром за сацыялізм,** быць сутаўной часткай рабочай клясы.

Тав. Шапіра падрабязна спыняецца на пытаньнях правядзеньня бесьперапыннай вытворчай практыкі, удзелу гаспадарчых арганізацый у рабоце навучальных устаноў, на пытаньнях барацьбы з бракам у падрыхтоўцы кадраў.

— Таму, — канчае тав. Шапіра, — мы павінны рашуча змагацца супроць спроб зьніжэньня тэмпаў, супроць дзяцькага тлумачэньня тыпу спэцыяліста, супроць праваапартуністычнага самацёку ў падрыхтоўцы кадраў, супроць «лявацкага» спрашчэньства ў гэтым пытаньні, жаданьня на ўра вырашыць гэту праблему, за бальшавіцкую партыйнасьць у справе выхаваньня кадраў, бязьлітасна змагаючыся з апартуністамі, примірэнцтвам і гнілым лібералізмам у рабоце па падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для сацыялістычнага будаўніцтва.

Больш увагі выданьню літаратуры на мовах нацменшасьцяй

Забясьпячэньне прапоўных мас нацменшасьцяй БССР марксыцка-ленінскай, масава-палітычнай, навукова-папулярнай, тэхнічна-гаспадарчай літаратурай і пашкол падручнікамі зьяўляецца адной з галоўнейшых задач у ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі.

У мінулым годзе выкапана толькі невялікая частка выдавецкага пляну па літоўскай літаратуры. Беларускім аддзяленьнем Цэнтравыдавецтва надрукавана толькі каля 20 друкаваных аркушаў замест 150, прадугледжаных плянам.

«Літоўскі сэктар» Беларускага аддзяленьня Цэнтравыдавецтва ня выканаў усяго пляну, з прычыны слабай паліграфічнай базы, а таксама і таму, што аўтары і перакладчыкі занягвалі здачу даручаных ім рукапісаў. Усё-ж такі было надрукавана на працягу мінулага году каля 90 друк. аркушаў.

Яшчэ горш з падручнікамі. У мінулым годзе надрукавана толькі чытанка для II-ой групы лемантар. На працягу заходніх трох месяцаў друкарня ня выпусьціла ніводнай кнігі на літоўскай мове. 1-ая частка чытанкі для III-ай групы «На ленінскім шляху» ў друкарні знаходзіцца ўжо трэці месяц. Кніга набрана, зьвярстана, зроблена карактура і чамусьці ня друкуецца. Чакаюць сваёй «чаргі»: 2-я частка чытанкі для III-ай групы, 1-я кніжка нашыя лемантара і дзьве першыя кніжкі па матэматыцы.

Рэдакцыйна-выдавецкі план літоўскіх выданьняў ДВБ на 1932 г. павялічан да 265 друк. аркушаў. Для выкананьня гэтага пляну патрэбна, каб друкарня значна павялічыла свае тэмпы работы, каб у гэтым годзе на працягу месяца яна друкавала літоўскіх выданьняў больш, чым яна друкавала на працягу ўсяго мінулага году, бо інакш і ў гэтым годзе выдавецкі план ДВБ на літоўскай мове цалкам ня будзе выкананы. Прадстаўнікі тэхкіраўніцтва друкарні імя Сталіна тлумачаць «становішча» недахватам набораніцкай, прыфтоў і г. д.

Трэба, каб адпаведныя органы зацікавіліся тэхнічнымі магчымасьцямі друкарні імя Сталіна і стварылі такія паліграфічныя ўмовы для нацменшасьцяй выдаваньня, пры якіх усе намечаныя пляны можна было-б поўнасьцю рэалізаваць.

ВІЛУНАС.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

Аднаасобны сэктар недавыканаў яшчэ 21,7 проц. пляну збожжазагатовак

29-га лютага

Пятая пяцігодка лютага ня толькі ня прынесла пералому ў збожжазагатоўках, але, наадварот, дала яшчэ большае зьніжэньне тэмпаў. Паводле даных Наркамснабу, на 26 лютага гадавы план збожжазагатовак па рэспубліцы выкапан на 89,5 проц. Прырост за пяцідзёўку складае ўсяго 0,1 проц. гадавога пляну.

Гэтыя лічбы яшчэ раз сьцьвярджаюць сур'ёзную пагрозу зацяжнай завары пэўнага збожжазагатоўчай кампаніі. Яны гавораць аб тым, што ў большасьці раёнаў пануюць дэмабілізацыйны настрой, што некаторыя раённыя арганізацыі і сельсаветы схільна згарнуць збожжазагатоўкі, ня выканаўшы поўнасьцю гадавога пляну.

Такія настроі нельга назваць інакш, як іншрова - апартуністычнымі. Яны павінны сустрэць зьнішчальны адпор з боку ўсіх партарганізацый.

Прыклад перадавых калгасаў, пакшталт калгасу **«Чырвоная ніва»**, Полацкага раёну, якія ня толькі выконваюць збожжазагатоўчыя заданьні, але высоўваюць і з посьпехам ажыцьцяўляюць сустрэчныя пляны, павінны быць падхоплены ўсімі калгасамі. Неабходна дабіцца, каб у бліжэйшыя дні ня было ні аднаго калгасу, ня выканаўшага поўнасьцю сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай.

Галоўную ўвагу трэба канцэнтраваць на ліквідацыю адставаньня аднаасобнага сэктару, які недавыканаў яшчэ 21,7 проц. гадавога пляну. Разгортваньнем шырокай масава - арганізацыйнай работы сярод аднаасобнікаў—бедняцкой і сераднякоў, арганізацыяй калгасных буксіраў у адстаючых сельсаветах трэба кінуць поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак кожным сельсаветам, кожнай вёскай.

Нарэшце, сусім недапушчальна становішча са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў. На 26 лютага цьвёрдыя заданьні з кулацка - заможных гаспадарак спагнаны толькі на 48,4 проц. Гэта сьведчыць аб слабым, з месцамі і поўнай адсутнасьці націску на кулацка - заможныя элемэнты, аб прымірэнцтвах адносінах да кулака з боку некаторых раённых арганізацый і сельсаветаў.

Цьвёрдыя заданьні павінны быць спагнаны поўнасьцю і неадкладна. Трэба зламаць кулацкі сабатаж прыпрятнуць кулацка-заможныя гаспадаркі, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, да судовай адказнасьці. Канкрэтныя посьпехі праваапартуністычнай практыкі, якія патураюць кулацтву, дапамагаюць яму ўхіліцца ад здачы збожжа дзяржаве, павінны сустрэць бязьлітасны адпор.

Вялізарнае значэньне набывае прапанова калгасу **«Зялёны клін»** Харкаўскай вобласьці (УССР) аб арганізацыі **збожжавага фонду другой пяцігодкі імя тав. Сталіна.** Сёньня мы друкуем першы подпіс на гэту прапанову —калгасьнікаў калгасу **«Случ № 2»** Слуцкага раёну, якія ўнесьлі ў збожжавы фонд другой пяцігодкі імя тав. Сталіна 2 цэнт. збожжа.

Ініцыятыва калгасьнікаў «Зялёнага кліну» павінна быць падхоплена ўсімі калгасамі БССР.

АРГАНІЗУЕМ ЗБОЖЖАВЫ ФОНД 2-й ПЯЦІГОДКІ ІМЯ тав. СТАЛІНА

КАЛГАС **«ЗЯЛЁНЫ КЛІН»**, ВОЎКАЎСКАГА РАЁНУ, ХАРКАЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ (УССР) ЗЬВЯРНУЎСЯ ПРАЗ ГАЗЭТУ **«РОДЯНСКЕ СЕЛО»** ДА УСІХ КАЛГАСАЎ УКРАІНЫ І СССР З ЗАКЛІКАМ АРГАНІЗАВАЦЬ ЗБОЖЖАВЫ ФОНД 2-ОЙ ПЯЦІГОДКІ ІМЯ ТАВ. СТАЛІНА.

ПЕРШЫМІ Ў БССР АДГУКНУЛІСЯ НА ГЭТЫ ЛІСТ СЕЛЬКОРЫ **КАЛГАСУ «СЛУЧ» № 2, СЛУЦКАГА РАЁНУ.** ЯНЫ Ў СВАЕЙ ГАЗЭЦЕ-ШТОДЗЕНЦЫ «ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ» ЎЗЬНЯЛІ ПЫТАНЬНЕ АБ ПАДТРЫМАНЬНІ ВЫКЛІКУ КАЛГАСУ «ЗЯЛЁНЫ КЛІН».

«ПАДТРЫМЛІВАЮЧЫ НАДЗВЫЧАЙ КАШТОЎНАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ І ПРАПАНОВУ КАЛГАСУ «ЗЯЛЁНЫ КЛІН»,—ПІСАЛІ СЕЛЬКОРЫ,—ЗАКЛІКАЕМ УСІХ СЕЛЬКОРАЎ І КАЛГАСЬНІКАЎ СЛУЧЧЧЫНЫ І УСЕЙ БССР ПАСЬЛЕДАВАЦЬ ГЭТАМУ ПРЫКЛАДУ».

У ДЗЕНЬ ПРЫЕЗДУ Ў КАЛГАС «СЛУЧ» № 2 ВЫЯЗНОЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА ПРАВЕРЦЫ ХОДУ КОНКУРСУ «ПРАВДЫ», НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ, У АДКАЗ НА ЛІСТ СЕЛЬКОРАЎ, БЫЛА ВЫСУНУТА ПРАПАНОВА **АБ УНЯСЕНЬНІ Ў ЗБОЖЖАВЫ ФОНД ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ІМЯ ТАВ. СТАЛІНА 2 ЦЭНТН. ЗБОЖЖА.**

СХОД АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЎ ГЭТУ ПАСТАНОВУ І ЗЬВЯРНУЎСЯ ДА КАЛГАСАЎ СЛУЧЧЫНЫ І УСЕЙ БССР З ЗАКЛІКАМ ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У АРГАНІЗАЦЫІ ЗБОЖЖАВАГА ФОНДУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ІМЯ ТАВ. СТАЛІН..

Р. С.

Дзяржаве недаданы тысячы цэнтн[ераў] збожжа

КАПЫЛЬ, 24. (БЕЛТА).

План збожжазагатовак па раёне выкананы на 86 проц. Асабліва марудна ідзе спагнаньне збожжа па цьвёрдых заданьнях з кулацка - заможных гаспадарак (63,5 проц. пляну). У выніку — дзяржаве недадана 4.306 цэнтн. збожжа.

Рад сельсаветаў — Сл. Курганскі, С. Капыльскі, Бабаўлянскі, Браткаўскі — усім спынілі збожжазагатоўкі. З усіх сельсаветаў раёну толькі адзін Старыцкі сельсавет выканаў план на 101,8 проц. Работа вакол усебеларускага конкурсу на лепшае завяршэньне збожжазагатовак у раёне не разгорнута. Выкарабская партыйчэйка сельсавету, дзе план збожжазагатовак выкапан на 66,9 проц. — аб конкурсе нават і ня ведае. Трэба адзначыць, што паотул многія сельсаветы і партыйчэйкі раёну, замяўшыся падрыхтоўкай да вясны, ня ўважаюць гэту работу з задачай хутчэйшага завяршэньня збожжазагатовак.

Захаваньне і падрыхтоўку каня да вясны— пад пэрсанальную адказнасьць

Да адказнасьці за разбазарваньне цягавай сілы

ГАРАДОК. (Наш кар.).

Гарадоцкі раён — адзін з асноўных ільнаводчых раёнаў. Таму падрыхтоўка і захаваньне каня да вясны ў Гарадокшчыне набывае асаблівае значэньне. Між тым, у радзе калгасаў раёну пад уплывам кулацкай агітацыі, якая не сустракае адпору, мы наглядаем самае злачынае разбазарваньне конскай цягавай сілы.

Па раёне за 2 месяцы 1932 году загатоўлена 1.466 конскіх скур з іх 1.241 буйная. Гэтыя лічбы паказваюць, што ў раёне не вядзецца ніякай барацьбы з тайным забоем коняй. У калгасе «Чырвоная зара» коні стаяць у сырых і халодных хлявох і прапна дагледзяцца. У выніку — 14 коняй захварэлі. У калгасе імя Анапскага коні ня поюцца па тры дні.

Тут мы маем справу з простым мана ўрам кулака, які шляхам зьнішчэньня конскай цягавой сілы імкнецца сарваць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Як-жа рэагуюць на такое становішча з захаваньнем і падрыхтоўкай каня да вясны раённыя арганізацыі?

Райвыканкомы з бюракратычным спакоем паглядзелі: на час сяўбы ў раёне ня хопіць 41.386 конадзён. І на гэтым паставілі крапку. Далейшае яго, як быццам ня турбуе. Райкалгасасаюз і МТС таксама не праяўляюць асаблівай клапатлівасьці.

— Гэтым пытаньнем займаецца райКК-РСІ — весь адказ, які можна атрымаць у раённых установах.

Мы лічым, што вінаватыя ў разбазарваньні конскай цягавой сілы павінны адказаць перад пралетарскім судом.

Мікуцкі.

ДАБІЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

Сацыялістычны сэктар Уваравіцкага раёну павінен засеяць у трэцюю бальшавіцкую вясну амаль 18.000 гэкт. На аднаго каня прыпадае звыш 7 гэкт. Ужо зараз у раёне не хапае кала 200 коняй. Гэта вымагае асаблівай увагі да захаваньня конскай цягавай сілы.

Між тым у радзе калгасаў, як «Вазор», «Вольная праца», «Камунар» і інш. дагэтуль ня выпрацаны пастаянныя брыгады па догляду за коньмі. У выніку абязьлічкі коні зусім аморны, кармы скарыстоўваюцца нежаномна, разбазарваюцца расьцягваюцца і прадаюцца на прыватны рынак.

У калгасе «Вольная праца» калгасьнікі бяруць коняй для сваіх патрэб без усякага дазволу і зьвяртаюць іх тады, калі ўздумаюць. У калгасе імя Леніна з прычыны надбайлых адносін даглядчыкаў коні замест сена харчуюцца саломай.

Зусім недапушчальныя адносіны да захаваньня конскай цягавай сілы праяўляюць некаторыя раённыя арганізацыі. Напрыклад, камісія па выбракоўцы шворых коняй шворгёзна падыходзіць да гэтай справы. Нагледаюцца выпадкі, калі ў лік выбракаваных коняй трапляюць зусім працаздольныя.

Казімірэў.

Юр. Такарчук, Вал. Гаранін, Ул. Мяжэвіч

ПАКЛЕП НА ЗАВОД

Нарысы Янкі Скрыгана „Гомсельмаш“, „Маладняк“ № 10 1931 год

Гомельскі завод сельска-гаспадарчых машын — адзін з самых буйных заводаў новай сацыялістычнай індустрыі Савецкай Беларусі. **Гомсельмаш** — гэты адзін з первенцаў бальшавіцкай пяцігодкі — адыгрывае ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, асабліва ў разгортваньні **сацыялістычнай жывёлагадоўлі,** вялікую ролю. **Сіласарэзкі, сячкарні, бульбамойкі і бульба сартоўкі** з гомсельмашаўскай яркай зялёна-чырвонай маркаю вядомы ў саўгасах і калгасах усіх савецкіх рэспублік.

Першыя кварталы мінулага году былі для завода месяцамі асабліва напружанай **барацьбы** за аўладаньне механізмамі і працэсамі вытворчасьці. Так званы «пускавы пэрыяд», пэрыяд «дзіцячых хвароб» запягваўся, вытворчая праграма недавыконвалася, са дня на дзень расла запазычанасьць дзяржаве.

Для дапамогі арганізацыям заводу рэдакцыяй **«Зьвязды»** была паслана на Гомсельмаш спэцыяльная выязная брыгада. Гэта брыгада за чэрвень і ліпень — за месяцы сваёй работы на заводзе — правяла вялікую практычную работу, ускрыла рад асноўных прычын недавыкананьня праграмы, на справе дапамагла іх зьнішчыць.

Работа выязной брыгады супала з тым нарыдам, калі ўся пралетарская краіна прапрацоўвала пастановы **чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б),** калі ўся сацыялістычная прамысловасьць пераключылася на работу **па-новаму,** на аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў шерамоті вылучаных тав. **Сталіным** у сваёй гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў.

«Зьвязда» матар'ялам сваёй брыгады дала разгорнуты **паказ** таго, як выкараненьне абязьлічкі і ўраўнілаўкі, смелае і шырокае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, арганізаванага набору рабочай сілы і г. д. далі заводу вялікі **вытворчы эфэкт.**

Людзі - ударнікі, рабочы калектыў Гомсельмашу, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, зададасьцю і гераізмам, аўладаньнем тэхнікай павышэньнем кваліфікацыі ўжо ў пачатку жніўня завалвалі пералом. Пазьней гэты пералом замацавалі. Усьлед бальшавіцкі разгон у рабоце, бальшавіцкія тэмпы і гэтых тэмпаў не здаюць і па сёньняшні дзень. Вось, напрыклад, 19 лютага 1932 г. «Гомсельмаш» выпусьціў: 33 сілясарэзкі—**106,4** проц. пляну; 17 сячкарань — **100** проц., 22 бульбасартоўкі — **129,4** проц. Апрача таго, завод першым у Савецкім Саюзе прыступіў да выпуску сваёй новай машыны — кажэпынасартоўкі, якая раней прывозілася з Нямеччыны. Выпрабаваньне гэтай машыны паказала высокую ня тэхнічную якасьць.

На гэтым фоне зьяўляюцца зусім **недапушчальныя,** ні ў якой ступені **нецярпімыя** «літаратурныя практыкаваньні» Янкі Скрыгана ў сваіх нарысах «Гомсельмаш».

Ня гледзячы на тое, што Скрыган, як член МопАПП'у быў уключаны ў брыгаду «Зьвязды» па Гомсельмашы, якая зусім правільна і глыбока асьвятляла барацьбу заводу за вытворчую праграму, ён у сваіх нарысах, вымешчаных, у 10 нумары органу БелАПП'у «Маладняк» уводзіць гашебны шулерскі паклёп на савецкі завод і яго ўдарнікаў.

Вось некалькі «партрэтаў» ударнікаў, высокакваліфікаваных майстраў і кіраўнікоў заводу, старанна намаляваных Скрыганам.

Начальнік зборачнага цэху **Белабжэцкі** —

«**Доўгі,** худы, на танкпавых нагах, з нагнутым наперад тулавам; хварабітым, з уполымі шчанамі і неахайна надулымі губамі... Вялікімі пукатымі вачамі на сухотным твары Белабжэцкі шукае РБ (разьмеркавальнае бюро)... Белабжэцкі стаіць, чуць падаўшыся наперад, на крышку прыгнутых цыбатых нагах, Белабжэцкі ідзе буславатаю хадою...»

Загадчык РБ — **Перцын.** У яго — «тоннія хітрыя разрэзы вач і шырокая неахайная складка губ. Перцын заўсёды зьяўляецца мупіканватаю, ціхаю хадою...»

Начальнік мэханічнага цэху — **Дрыц** —

«**Тоўсты,** здаравенны мужчына... На круглым твары яго тоўстыя, неахайна загнутыя губы трасуцца».

Цэхавы плянавік **Мацьвеенка** —

«**Худы,** шчуплы, тонконосы, ён па крыўджана моргае вачыма і ў яго доўга трасуцца пальцы, пазтрабна, непатрэбна...»

Сакратар партыйнай ячэйкі **Кесьлер** —

«галава яго зусім прыгнута ўніз, прыкушана ніжняя губа і вочы глядзяць на Дрыца зусім з пад ілбе, праз бровы. Ён гаворыць, што сёньня будзе сход ячэйкі,... але Дрыц ня чуе...»

Інжынэр **Фэльдман** —

«Не дашоўшы да паўдарогі, ён сунімаецца і, прыгнуўшы галаву, скубе пальцамі губу. Рвануўшы губу, ён паварочвае і ідзе ў кавальскі цэх. У Фэльдмана востры, кпінаваты ў барадзе, твар, востры гарбаваты нос і вялікія з высокімі павекамі вочы... На худой, тонкай шыі ў Фэльдмана слабна аб'ехаў, паморшчыўся заношаны з гальштукам каўнэрык...»

Дырэктар «Рухавіка рэвалюцыі» Сідарэнка —

«Высокі, пляскаты з рабацінным і шчарбатымі зубамі».

Былы дырэктар заводу **Фалкін** —

«У Фалкіна брытая круглая галава, круглы твар, круглыя губы, і толькі крыху парушае гэтую прэцэ круглясьць гарбаваты, павоі загнуты нос. Галава сядзіць на кароткай шыі і ўвесь ён здаецца шырокім і за вялізным сталом маленькім».

Сакратар партыйнага калектыву **Генкін** —

«Зусім маленькі. Маленькі, складзісты, грузны, з павольнаю, але грузнаю хадою. Вялікая кашуля шчыльна сьцягвае яго круглыя, здаровыя плечы. Кучаравая галава на кароткай мускулістай шыі сядзіць нізка».

Што гэта — жыныя людзі, якія аддаюць свае сілы, свае веды і ўменьне заводу, справе рэвалюцыі, змагаюцца за бальшавіцкую тэхніку, за поўнае ажыцьцяўленьне вытворчай праграмы? Не! Гэта злосныя карыкатуры, памфлет на будаўнічай сацыялізму, хаджэньні нахмельныя бязпушныя жанчэны, якія без усялякіх прыкрас могуць быць вымешчаны ў любой фашысцкай, або беларэмігрантскай газэце. Тут мы маем спрэ Ўэф таго, як пад шыльдай «рэалізму» працягваюцца **клясава-варожыя** выказваньні, уводзіцца паклёп на сацыялістычную прамысловасьць.

Гэта яшчэ больш пацьвярджаецца тым, як Скрыган малюе чалавека **другога лягеру,** чалавека з «былых людзей», які працуе за грошы, за захаваньне сваёй скуры. Такім зьяўляецца на заводзе **Міхайлаў.** Скрыган аб ім піша:

«І чалавек сам увесь дасьціпны. Ён чыста выбрыты, пастрыжаны, пры чэсаны, і ў яго вельмі добра, строга, але цёпла і разумна глядзяць чарнявыя вочы. У яго невялікі твар. Нават твар вастраваты, энэргічны з тонкімі кстоіцамі і з невялікімі складкамі на ілбе. І яму вельмі ідзе, што на скронях, між чорных цьвёрдых валасоў густа праскакваюць срэбрыстыя нітачкі. Гэта да яго выклікае пошану. І калі яго не паважаюць, як загадчыка аддзелу забясьпячэньня, дык гэта памылка».

Якія прычыны былі ў тым, што ў першай палове 1931 г. цэлы рад заводаў Савецкага Саюзу, у тым ліку і Гомсельмаш, ня выконвалі сваіх праграм? Першая і галоўная «прычына заключаецца ў тым, што за апошні час умовы разьвіцьця прамысловасьці зьмяніліся ў горані, стварылася новая абстаноўка, якая патрабуе новых прыёмаў кіраўніцтва. А некаторыя нашы гаспадарнікі замест таго, каб зьмяніць прыёмы работы, усё яшчэ працуюць па-старынцы» (Сталін).

Апартуністычнае кіраўніцтва заводу было зьменена. І ўжо ў той момант, у трэцім квартале 1931 г., Гомсельмаш пачынаў **працаваць па-новаму,** разгортваў тэмпы работы на аснове рэалізацыі ўказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна.

Простым абавязкам «нарысіста» Скрыгана быў правільны, глыбокі паказ гэтага пераходу на новыя рэйкі, паказ таго, **ЯК** завод пабіўся пералому, **ЯК** ён гэты пералом замацоўваў.

Замест гэтага Скрыган набліжае ўвесь свой бедны лексікон для «мастацкага» выяўленьня глыбіні прарыву. Ён піша:

«Завод у прарыве. Завод хворы. Тэмпэратура рэзка хістаецца. Ліхаманка ідзе з цэху ў цэх. Халодныя пінбы прарыву крычаць. Завод хворы. Тэ

НАВІГАЦЫЮ 4-га, ПЯЦІГОДКІ СУСТРЭЦЬ ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ ВА УСЕУЗБРАЕНЬНІ!

Днепра-Дзьвінскі басэйн у сыстэме народнай гаспадаркі БССР займае выдатнае месца. Грузазварот рэчнага транспарту на гэтым басейне расьце з году ў год шпаркімі тэмпамі. Досыць сказаць на тое, што ў мінулым годзе па водных шляхох БССР было перавезена грузаў на 75 проц. больш, чым у 1930 годзе.

Побач з бясспрэчнымі ёрухамі ў рабоце Днепра-Дзьвінскага рэчнага транспарту ўсё яшчэ ёсьць буйныя недахопы. Аб гэтым выразна сказаў лістападаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які па дакладу Днепра-Дзьвінскага пароходства падкрэсьліў, што **«рэчны транспарт не скарыстаў усіх магчымасьцей у бягучай навігацыі і дагэтуль застаецца самым адсталым участкам народнай гаспадаркі БССР».**

Трансфінплян навігацыі мінулага году пават пры шэрагу значных перапамяшчэньняў у тона-кілёмэтрах быў выкананы толькі на 60 проц. па перавозцы грузаў вялікай хуткасьці і на малой—па 59 проц.

Арганізацыя эксплёатацыйнага кіраўніцтва, косная і бюракратычная, слуўнае манэўраваньне унутранымі рэсурсамі, ураўнілаўка ў зарплаце і абязьлічка ў рабоце ладу сьвяньнуў рэчнага транспарту — сьявіліся галоўнымі тормазамі выкананьня плану навігацыі мінулага году.

Дрэнная планаваньне, з боку кліентуры сьвяліся таксама адной з прычын вялікага недагрузу і нерацыянальнага, нерацыянальнага выкарыстаньня фаёту.

Дакладнае вывучэньне тэхнічнай магутнасьці басэйну паказвае, што планы грузаперавозак у навігацыі 1931 году былі значна зьменшаны. Рэальная грузаадпраўленьне флёту Днепра-Дзьвінскага басэйну ў мінулым годзе па мінімальных падліках складала 19.053 тоны (у адзін рэйс). Калі ставіць улічыць мінімальны зварот флёту 5 раз у месяц пры эксплёатацыі 7 месяцаў навігацыі (май—лістапад), дык грузазварот павінен быў-бы вызначыцца (тонаж 19.053 × 5 × 7) у 666.855 тон супроць планавых 488.000 тон. З гэтых мінімальных падлікаў зусім ясна відаць, што план навігацыі мінулага году быў пазначаны супроць рэальнага прыблізна на 178.855 тон.

Большасьць карыснага хадавога часу флёт, як правіла, прастойваў пад загрузкай і выгрузкай, а на многіх выпадках зусім без работы.

Такім чынам, дырэктыва партыі аб максымальным выкарыстаньні тонажу засталася невыкананай, з прычыны адсутнасьці каляднага кіраўніцтва з боку эксплёатацыйнага апарату Днепра-Дзьвінскага кіраўніцтва.

Суднарамонт зьяўляецца важнейшым зьвяном у падрыхтоўцы рэчнага транспарту да выкананьня навігацыйных плянаў чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. Трэба проста сказаць, што пытаньне суднарамонту ў радзе месц пераацэньваецца і нават у пасобных месцах ігнаруецца. Флёт у затонах расстаўлен безгаспадарча, без захаваньня прадпісаных інтэрвалаў і г. д.

Пасобныя майстэрні ўдарна змагаюцца за аздараўленьне флёту, за бальшавіцкую падрыхтоўку яго да навігацыі. Па **Гомелі** план рамонту параходаў на 24 студзеня выкананы на 73 проц. Вецкі **Віцебску** разам з рабочымі заводу «Рухавік рэвалюцыі» прынялі выклік гомельчан аб датэрміновым скончаньні рамонту суднаў. Трэба, каб прыклад гомельскіх і віцебскіх водзмаў пасьледавалі і іншыя майстэрні і суднабудаўнічыя вэрфі Днепра-Дзьвінскага басэйну. Трэба, каб увесь апарат рэчнага флёту, на чале з партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі і гаспадарнікамі па-ўдарнаму павялі барацьбу за датэрміновае выкананьне і высокую якасьць суднарамонту, за поўную падрыхтоўку прыстаней да сустрэчы падыходзячай навігацыі.

Гаспадарнікі воднага транспарту павінны перавесьці на прагрэсыўна-прэміяльную аплату ўсіх рабочых, увесьці зьвэльнічыну, дакладна прапрацаваць нормы ў адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі вытворчасьці, дабіваючыся павышэньня прадукцыйнасьці працы водніка, шляхам поўнага скарыстаньня рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходніцтва водзікаў.

Днепра-Дзьвінскаму кіраўніцтву неабходна забясьпечыць фінансаваньне суднарамонту на месцох (па майстэрнях), а таксама і па новым суднабудаўніцтве, устанавіўшы пастаянны тэхнічны нагляд за ходам работ, з тым, каб забясьпечыць поўную падрыхтоўку флёту да перапага сакавіка.

Лістападаўскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў гаспадарнікаў Днепра-Дзьвінскага рэчнага флёту **«давесьці трансфінплян да гаспадарчых адзінак не пазьней, як за месяц да адкрыцьця навігацыі».** Гэтае заданьне павінна быць выкарыстана.

Да пачатку навігацыі 32 году трэба дэтальна распрацаваць і ўстанавіць адзіную сыстэму эксплёатацыі флёту, забясьпечыць максымальнае скарыстаньне самаплаву флёту на ўсіх рэках басэйну, тэсьлаўны адпавядасьць за гэта на начальнікаў прыстаней. Для зьніжэньня недахопаў эксплёатацыі 1931 г., калі прастой суднаў па прыстанях пад розными эпарацыямі даходзіў да 70 проц., вучастні прыстаней, неабходна забясьпечыць на ўвесь час навігацыі адказнымі агентамі руху.

Апарэлу кадраў Днепра-Дзьвінскага кіраўніцтва рэчнага флёту неабходна забясьпечыць адтаварны пабор начальнікаў прыстаней і работнікаў галоўных зьвеньняў водных гаспадаркі, асабліва эксплёатацыйнай часткі, дэтальна прапрацаваць план расстаноўкі і закацаваньня рабілы па флёце і бераговым складзе. Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў кліентуру да 15 студзеня 1932 году прадставіць пляны перавозак Днепра-Дзьвінскаму кіраўніцтву, але-ж у асноўным да гэтага часу пляны яшчэ не прадстаўлены.

ЦКК-НК РСІ абавязала пракуратуру БССР прыцягнуць да судовай адказнасьці кліентуру, якая злосна затрымлівае прадстаўленьне плянаў перавозак.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 19 студзеня 1932 году папярэдзіў таксама ГК, РК і КК КП(б)Б об іх адказнасьці за прарывы на водным транспарце.

Каб папярэдзіць буйныя перабоі мінулага году трэба ў першую чаргу фарсаваць тэмпы суднарамонту, мэханізаваць пагрузчана-разгрузчаных работы, падрыхтаваць і перападрыхтаваць кадры ў зімовы час, узкараніць гаспадарчы разрахунак на ўсе зьвенні рэчнага транспарту, узмацніць адзіначальле і г. д.

Рэчны транспарт БССР мае ўсе магчымасьці, можа і павінен яшчэ больш упэўнена эксплёатацыйную работу, шляхам карэннай яе перабудовы (сыстэматычнае кіраўніцтва рухам, маршрутызацыя рэйсаў і г. д.), больш эфэктыўна выкарыстаць тэхнічную магутнасьць флёту і яго самаплаў, унутраныя рэсурсы і інш.

АЛЕКСЕЯЎ, ГАФТ.

Заўтра старт лепшым паравозьнікам

ВА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС СПАРАНЫХ БРЫГАД

УКЛЮЧАЮЦЦА МАСЫ ЎДАРНІКАЎ ТРАНСПАРТУ

Масавае ўключэньне ў конкурс у гомельскім дэпо

У гомельскім дэпо разгарнулася баявая падрыхтоўка да ўсесаюзнага конкурсу спараных брыгад. Пытаньне гэта прапрацавана ва ўсіх цэхах. Абвешчаньне конкурсу выклікала шырокую хвалю творчай актыўнасьці паравозьнікаў і рабочых дэпо. Больш 10 машыністаў падалі заявы з просьбай аб дадатковым уключэньні іх у лік спаборнічаючых ва ўсесаюзным конкурсе і больш 30—у раённым.

Падрыхтоўка да конкурсу ахапіла ня толькі паравозьнікаў, але і ўсіх рабочых дэпо, работнікаў канторы і г. д.

У ступенчатым дэпо брыгада тав. **Максімава** прыняла шэфства над паравозам С-165. Брыгада абавязалася палепшыць якасьць рамонту, каб не дапусьціць нівоеннай паўторнасьці, ліквідаваць на 100 проц. затрымкі паравозаў у рамонце, поўнасьцю скарыстаць унутраныя рэсурсы, поўнасьцю зьнішчыць прагулы і спазьненьні на работу. За час конкурсу брыгада абавязалася ўпесьці 30 рацыяналізатарскіх прапаноў, палепшыць работу вытворчых нарад, поўнасьцю ахапіць тэхвучобай усіх членаў брыгады і падрыхтаваць двух сьлесароў з чорнарабочых.

На выклік брыгады Максімава адразу адгукнулася брыгада тав. **Злотнікава.** Яна ўзяла шэфства над паравозам С-52.

У конкурс уключыліся таксама памочнікі дзяжурных па дэпо — **Варушчэнка Р. і С., Вайтэкунас і Нічык.** Яны абавязаліся давесьці экіпіроўку паравозаў за адзін гадзіны замест 2-х, дабіцца стопроцантнай прабіўкі цымагарных труб паравозаў, сачыць за своячасовым выкананьнем рамонту на ўсіх запісаных пунктах і за своячасовай выдачай паравозаў над цягнікі, і выклікалі на спаборніцтва памочнікаў дзяжурных па дэпо Віцебск.

Прапаўнікі галоўнай канторы дэпо, уключыўшыся ў конкурс, прынялі абавязацельствы — своячасова складаць усе справаздачы, весьці ўлік выкананьня вымяральнікаў, узмацніць працэсыцыплёну і палажыць сапспаборніцтва і ўдарніцтва сярод работнікаў канторы.

Аршанскія работнікі службы руху выклікаюць віцебскіх

Абвешчаны другі ўсесаюзны конкурс на лепшую спараную брыгаду мае вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Ён адыгрывае вялікую ролю ў справе аздараўленьня паравознага парку. Улічваючы што посьпех усесаюзнага конкурсу ў значнай ступені залежыць і ад выразнай работы працаўнікоў службы руху, мы работнікі службы руху станцыі **Ворша,** уключаемся ў конкурс і бярэм на сябе наступныя абавязкі:

Дасягнуць стопроцантнага сьледзяваньня цягнікоў па раскладзе, поўнай маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў, перавыкананьня кафіцыенту манэўровай работы, зьніжэньня прастою вагонаў пад грузавымі апэрацыямі. Не дапусьціць ніводнага зрыву манэўровай ягды па кандуктарскім рэзэрве. Гэтыя абавязацельствы шырока прапрацаваць на зьвенах сярод кэмэрцыйных работнікаў, кандуктарскіх брыгад, грузчыкаў і дыспэтчараў. Выклікаем на сацспаборніцтва Віцебск і Смаленск.

Трыкутнік службы руху станцыі Ворша: **Багданаў, Кавалеўскі, Барабан.**

Прэміі лепшым з лепшых

Гэтымі днямі журы першага ўсесаюзнага конкурсу на лепшую спараную брыгаду разьмяркоўвала прэміі паміж брыгадамі, якія заняці перадавое месца.

Першыя прэміі па 2.950 руб. вызначаны спараным брыгадам пасажырскага паравоза С-52 імя газеты «Рабочий» (дэпо Гомель) **Мельнікава і Хімакова** і спаранай брыгадзе таварнага паравоза Ш-561 (дэпо Менск) **Досіна і Курыловіча.** У сувязі з тым, што паравоз Ш-561 атрымаў прэмію ў суме 1.300 руб. на дарожным конкурсе, яму выплачваецца толькі розьніца ў сумах прэміі.

Спараныя брыгады пасажырскага паравоза С-305 (дэпо Жлобін) машыністаў **Хахова і Залёнкі** і таварнага паравоза ОЧ-4631 (дэпо Гомель) машыністаў **Казлова і Сяргеева** прэміраваны па 1.500 руб. Усім спараным брыгадам гэтых паравозаў выдаюцца таварныя граматы, а машыністам — годнасьць лепшых машыністаў БССР.

Аграча таго журы пастанавіла надаць годнасьць лепшых машыністаў БССР т.т. **Тарэлкіну, Дзмітраву, Лазоўскаму, Гарэлаву, Мельнікаву, Праведнаму, Бусьлейку, Іваноўскаму, Коська, Ветраву, Сенажынскаму і Вігдорчыку,** а спаранным брыгадам паравозаў С-814, С-165, С-13, СУ-9788, СУ-9787 граматы на годнасьць лепшых спараных брыгад БССР.

Пераходны сьцяг газеты «Рабочий» вызначан дэпо Гомель за лепшы паказальнік у рабоце ў часе конкурсу. За апэрацыйна-масавую работу, праведзеную ў часе конкурсу гомельская раённая чырвоная газэтай «На сацыялістычных рэйках», журы выдала прэмію 400 руб.

Змыць ганебную пляму

Віцебская **шэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі»** выканала дагэтуль ганебнае заданьне толькі на 55,7 проц. Кіраўнікі фабрыкі дагэтуль ігнаруюць апраўдаць недазвальную работу спасылаўшыяся на перабоі ў падачы току: гэта прычына, быццам, перашкаджала выкананьню прамфінпляну.

Але работа фабрыкі за 4-ю пяцігодку, калі пры поўным забесьпячэньні матар'ялам і электраэнэргіяй праграма была выкананна толькі на 66 проц., сьведчыць аб тым, што «аб'ектыўныя прычыны» зьявіліся толькі прыкрай для прыкрыцьця бязьдзейнасьці.

Брыгада ВСНГБ, якая правярала становішча фабрыкі, выявіла рад агідных вытворчых недадоў. Зьмена - сустручны пляны, як сыстэма, не практыкуюцца. Улік іх по нядзелям. Бывалі выпадкі, калі брыгады, на выкананьне вытворчага заданьня, высоўвалі сустручны, які таксама не аскіць пяўлаўся. Для таго, каб ліквідаваць абязьлічку ў нагляде за абсталяваньнем, прадпрыемства перавесена на пасьцяжнёўку, і машыны прымацаваны за рабочымі. Але пасьля рамонту машыны школі не парочаюцца тым рабочым, за якімі яны замацаваны.

Масавая работа сярод рабочых пастаўлена нездавальняюча. У выніку — прагулы, спазьненьні на работу. Якасьць прадукцыі далёка не на вышыні. Ёсьць некаторы эрух у барацьбе за якасьць у пасобных бручных істужках, але ў большасьці агрэгатаў пералому яшчэ няма.

Процант браку, замест плянавых 1,2 проц., складае 4.

Калі дадаць да гэтага слабую работу ЗРК, дык прычыны адставаньня стануць зусім зразумелымі.

Невыкананьне трансфінпляну прывяло да таго, што фабрыка недадала крайне 147 тысяч пар штанаў, 41 тыс. піджакоў і 30.400 пальтаў.

Зараз пры непасрэдным дапамозе брыгады ВСНГ фабрычныя арганізацыі прынялі рад мер па ліквідацыі адставаньня. Частка задазычаваньні разьвярстана па цэхах, як дадатак да асноўнага заданьня. Гэта мерапрыемства павінна гарантаваць выкананьне 27 тыс. пар штанаў 8 тыс. піджакоў і 400 пальтаў.

Для падачасьнага ліквідаваньня бярэцца і зьменна - сустручнага выкананьня, для вызначэньня лепшых агрэгатаў вызначэньня пітоўных пераходных сьцяг. Ён перадаецца істужцы, якая паказала лепшы ўзор работы. Істужка, што атрымала пераходны сьцяг, мае права карыстацца сталоўдарніка, які зараз арганізаваны. Такім чынам, штодзенна выпаўняюцца лепшыя барацьбіты за прамфінплян.

Праведзены нарады работнікаў ЗРК і сталоўкі па выкананьні аб палепшэньні іх работы. З ЗРК заключаны дагавор на пераважнае снабжэньне лепшых ударнікаў.

На вытворчай нарадзе рабочыя тэхнарсанал рамонтнай майстэрні ўзялі на сябе абавязацельства — на працягу 5 дзён капітальна адрэмантаваць тры спэцмашыны, што выйшлі са строю.

У выніку праведзенай работы, назіраецца некаторае нарастаньне тэмпаў. Такі, калі 19 лютага прамфінплян быў выкананы на 81,9 проц., дык 20-га ужо ёсьць павялічэньне да 85,6 проц.

Прамфінплян фабрыкі зусім рэальны. Гэта наглядна паказваюць асобныя істужкі, якія перавыконваюць заданьне, маючы тое-ж абсталяваньне, матар'ялы і колькасьць рабочых, як і іншыя, што адстаюць.

Пры правільным кіраўніцтве фабрычных арганізацый, пры належнай увазе да рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна праграма будзе выкананна.

Рабочыя фабрыкі ня раз паказвалі сваё жаданьне працаваць па-ўдарнаму, сваю непахісную волю заваяваць перамогу.

Поўным ажыцьцяўленьнем плану па колькасных і якасных паказальніках ударнікі «Сьцягу індустрыялізацыі» павінны змыць ганебную пляму і заняць месца ў першых радох барацьбітоў за прамфінплян.

Тэлін.

Усебеларускі сталінскі паход фабрычна-заводзкага друку

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЎЗНАЧАЛЬВАЮЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ РАБОТЫ ПА СТАЛІНСКІМ ПАХОДЗЕ

Менск уключыўся

У сувязі з абвешчаным «Зьвяздой», ЦСПСБ і «Рабсельнорам» сталінскім паходам-спаборніцтвам нізавога фабрычна-заводзкага друку арганізацыямі і прадпрыемствамі Менску разгортваецца вялікая работа.

25 лютага адбылася, скліканая Мінгаркомам КП(б)Б, агульна-гарадзкая нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражак, якая пастанавіла ўключыцца ў сталінскі паход-спаборніцтва і намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па разгортваньні апэрацыйна-масавай работы вакол паходу непасрэдна на прадпрыемствах.

29 лютага гаркомам КП(б)Б скліканая агульна-гарадзкая нарада членаў рэдкалегій шматтыражак і насьцэнгазэт, прысьвечаная сталінскаму паходу-спаборніцтву. На нарадзе з дакладам об выніках 17-ай усесаюзнай партканферэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б і задачах фабрычна-заводзкіх газэт і рабкораў у сувязі з сталінскім паходам выступіць сакратар гаркому КП(б)Б тав. ШПЭКТАРАЎ.

Парткалектывам АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ (Менск) разам са шматтыражкай выпучана пяцёрка па кіраўніцтве сталінскім паходам - спаборніцтвам. Уключыўся у паход культпалітсавет фабрыкі і распрацаваў рад мерапрыемстваў па паходу. У другой групе машыннага цэху на начной зьмене праведзен мітынг рабочых, прысьвечаны сталінскаму паходу-спаборніцтву. Скліканая нарада ўсіх членаў радкалегіі.

Задачы і ўмовы паходу прапрацоўваюцца сярод шырокіх мас рабочых

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу). Прадпрыемствы Віцебшчыны і нізавы друк уключыліся ў сталінскі паход. Створан штаб кіраўніцтва паходам з прадстаўнікоў гаркому партыі, гарпрафсавету, гарсавету, газэты «Віцебскі пралетарый». Радкалегіі шматтыражак і трыкутнікі фабрык і заводаў: «ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА», «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», «ПРАФІНТЭРН», «КАМІНТЭРН» імя КІМ, фабрыкі гнутай мэблі і Віцебскага чыгуначнага вузла, уключыўшыся ў паход, прыступілі да абгаварэньня ўмоў і задач паходу сярод шырокіх мас рабочых і выпрацоўкі канкрэтных самаабавязацельстваў па паходу. Віцебскі гарком партыі вынес спэцыяльную пастанову па пытаньні уключэньня Віцебшчыны ў сталінскі паход.

Рэдакцыя газэты «Віцебскі пралетарый» выклікала «Палескую праўду» (Гомель) на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні сталінскага паходу.

ЗАРУБЕЖНЫ.

* * *

ГОМЕЛЬ, 27. (Па тэлефону). Гарком КП(б)Б, гарпрафсавет, рэдакцыя газэты «ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА» і чыгуначная «ПА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭЙКАХ» уключыліся ва ўсебеларускі сталінскі паход нізавога фабрычна-заводзкага друку. Для кіраўніцтва паходам створан гарадзкі штаб, у які ўваходзяць прадстаўнікі гаркому КП(б)Б, «Палескай праўды», гарпрафсавету, заводу імя ЛАНЦУЦКАГА і СЕЛЬМАШУ. 29 лютага скліканцца агульна-гарадзкі зьлёт членаў радкалегій, шматтыражак і насьцэнгазэт, на якім будуць распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні сталінскага паходу.

Гарадзкі конкурс на лепшую штодзенку, які праводзіцца «Палескай праўдай», перакінуўся на выкананьне задач, пастаўленых сталінскім паходам. Чыгуначная газэта «ПА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭЙКАХ», у сувязі з паходам, выдала спэцыяльны нумар паравозной насьцэнгазэты «У барацьбе за спараную езду».

«Палеская Праўда» прыняла выклік «Віцебскага пралетарыя» на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні сталінскага паходу.

ГАФТ.

* * *

Цэнтральная рабочая радыё - газэта «ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ» ўключэцца ў абвешчаны «Зьвяздой» і «Рабсельнорам» усебеларускі сталінскі паход-спаборніцтва нізавога фабрычна - заводзкага друку.

Па пытаньнях сталінскага паходу працуе вызная рэдакцыя радыё-газэты ў Віцебску на заводзе «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ». Арганізуем заводзкую радыё-газэту «Молатавец» на менскім дрэваапрацоўчым заводзе. Першы нумар радыё-газэты выйдзе 2 сакавіка.

РЭДАКЦЫЯ «ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ».

Работу лясной каапэрацыі—на рэйкі разгорнутага савецкага гандлю

Лясная каапэрацыя БССР яшчэ невыстарчальна прыстасавала сваю работу да задач выкананьня вытворчых плянаў лясной прамысловасьці.

Праведзеная праверка таварных астач на 1 студзеня 1932 г. выявіла замарожваньне тавараабароту на лясной каапэрацыі на 4 млн. руб. Па асобных (Бялыніцкім, Тураўскім і Ельскім) лесрабкопах запас тавараў дасягнуў да двух месяцаў. Праўленьнем лесасэкцый зараз прыняты рашучыя меры да ліквідацыі замарожваньня тавараабароту. Старшыні Бешанковіцкага, Тураўскага, Кашыльскага лесрабкопаў адданы пад суд.

Да гэтага часу па асобных лесрабкопах ёсьць выпадкі разбазарваньня фондаў, прызначаных для снабжэньня лесарубаў. Так, Глускі лесрабкоп прыняў на забесьпячэньне дактароў, работнікаў Саюзхлеба, розныя саматужныя арцелі і інш. Бялыніцкі лесрабкоп толькі на адным вучастку разбазарыў: мукі 13 тон, круп — 1 тону, рыбы — ½ тоны, цукру — 184 кгр., масла — 215 кгр. Выдачы прадуктаў у гэтым лесрабкопе рабіліся ў большасьці па сыстэме прыватных запісак работнікаў лесправгасу і лесрабкопу.

Разбазарваньне фондаў часта праводзіцца ня толькі з ведама і санкцыі, але і па загадзе некаторых месцовых кіруючых арганізацый і ўстаноў. Так, Мазырскі РВК прапанаваў лесрабкопу ўзяць на снабжэньне з фонду лесазагатовак працаўнікоў прыбной базы. Глускі РВК прыкацаваў да лесрабкопу арцель спатры ў 200 асоб, не забясьпечыўшы іх спэцыяльным фондамі.

Патрэбна абвясьціць рашучую барацьбу падобнага роду вынарыстоўваньню фондаў лесазагатовак.

Слабым месцам у працы лясной каапэрацыі зьяўляецца разгортваньне грамадзкага харчаваньня і паляпшэньне яго якасьці. Надўных 80 сталовак далёка не задавальняюць патрэб лесарубаў у гарачай страве. Асобныя лесправгасы зусім ня маюць сталовак. Такі буйны лесправгас, як Бабруйскі, да 1-га студзеня гэтага году ня меў ні адной сталоўкі. У гэтым вінават і Лесбел, які ня выконвае гэндагавору аб адводзе лясной каапэрацыі памяшканьняў пад сталоўкі.

Сталоўкі лесрабкопу нездавальняюча забясьпечаны бульбай і гародзінай. Нарады на бульбу райсаюзамі вельмі часта ня выконваюцца. Асобныя райснабы, ня гледзячы на распараджэньне Наркамснабу, забараняюць лесрабкопам займацца самазагатоўкамі. Так, Слуцкі райснаб усю загатоўку лесрабкопу перадаў іншым арганізацыям.

Лясная каапэрацыя павінна ў бліжэйшы час дабіцца стопроцантнага ахопу лесарубаў гарачай стравай. Як мінімум, кожны лесрабкоп павінен адкрыці ня менш 2 культурных чайных. Разгортваньне самазагатовак, скарыстаньне ўсіх мясцовых рэсурсаў — асноўны шлях палепшэньня якасьці грамадзкага харчаваньня і абслугоўваньня лесарубаў.

Кіраўніцтва асобных леспрамгасаў, замест дапамогі лесрабкопам, ігнаруе іх, перашкаджае ў рабоце. Дырэктар Бешанковіцкага, напрыклад, лічыць што «мне ваша каапэрацыя непатрэбна. Калі захачу, я яе закрыю і адкрыю сваю краму (?) і буду гандляваць».

Лясная каапэрацыя справіцца з пастаўленымі перад ёю задачамі толькі тады, калі з боку гаспадарнікаў і прафсаюзаў будзе аказана ёй усямерная дапамога і падтрыманьне.

Тармозіць работу лесрабкопаў і так акалічнасьць, што да сёньняшняга дня райсаюзы не перадалі ім павінных і асноўных капіталаў. Па 28 лесрабкопах ня скончан падзел балянсаў з райсаюзамі. Больш, як 250.000 руб. гроўнай лесасэкцыі, ня зьвернуты аб'яднаньнямі Белкаапсаюзу. Усё гэта стварае цяжкае фінансавае становішча сыстэмы лясной каапэрацыі. Былі выпадкі, калі прыбываючы тавар для лесазагатовак і сплаву не выкупляўся з-за адсутнасьці сродкаў.

Прэзыдыум БКС абавязан у бліжэйшыя дні прыняць патрэбныя меры для ліквідацыі напружанага становішча.

Вінаватых-ж у замарожваньні тавараабароту, неправільным выкарыстаньні фондаў лесарубаў павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці, як дэзарганізатары рабочага снабжэньня.

Патрэбна стварыць усе ўмовы для пераключэньня лясной каапэрацыі на рэйкі разгорнутага савецкага гандлю. Для гэтага патрэбна па-бальшавіцку ўзяцца за сьвяшчэньне буйнейшых недахопаў у працы, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў работу кожнага лесрабкопу, за разгортваньне самазагатовак і шляпаковых сэкцый.

Брыгада «Зьвязды»:
Каждан, Кумок, Рубінштэйн.

На барацьбу са шкоднікамі лесу,

якія наносяць мільённыя страты народнай гаспадарцы

Лесбел, праводзячы эксплёатацыю лясной гаспадаркі БССР, зусім мала ўдае ўвагі палепшэньню яе становішча і барацьбе з лясными шкоднікамі. У выніку—заграмаджваньць у лесе надзвычай узрастае. Вялікія плошчы буралому распрацоўваюцца несвоечасова (па Рэчыцкім леспрамгасе ёсьць да 60 тысяч кв. м.). На лесасеках штогод застаецца значная колькасьць недарубаў, нераспрацаваных дрыўляных астач. Аборка загатоўленага лесу і яго праводзіцца са спазьненьнем, а ў некаторых месцох зусім адсутнічае.

Усё гэта стварае выключна спрыяючыя ўмовы для шырокага распаўсюджаньня шматлікіх шкоднікаў, па многіх леспрамгасах БССР (Асіповіцкі, Быгомльскі, Горацкі, Мазырскі, Рэчыцкі, Слуцкі, Чачэрскі і інш.

Асноўнымі відамі лясных шкоднікаў зьяўляюцца хвойны пільшчык, лічынкі майскага жука і нарэдаў. Навуковедасьледчы лесапрамысловы інстытут лічыць у 1930 годзе пачаў вывучэньне эпрэмонасьці беларускіх лясоў шкоднікамі, але-ж вынікі гэтых дасьледаў невыстарчальны. Неабходныя прафілактычныя мерапрыемствы для лепшэйшага ліквідаваньня далейшага пашырэньня шкоднікаў не праводзяцца. А тым часам яны наносяць надзвычай вялікія страты: каштоўныя дрэвы, якія заражаюцца шкоднікамі, паступова трацяць свой рост, сохнуць і гінуць. Страты ад майскага жука складаюць нада 3 млн. руб. у год.

ЦКК-НР РСІ па спэцыяльным даручэньні ўраду БССР, зараз праводзіць абсьледаваньне для выяўленьня асноўных вачагоў распаўсюджаньня шкоднікаў і намячэньня канкрэтных мер барацьбы з імі.

Неабходна, каб спэцыялісты, работнікі на месцох прынялі-бы актыўны ўдзел у гэтай справе і агульнымі сіламі зьнішчылі гэтага ворага лясной гаспадаркі.

Я. КРАСАЎСКІ.

Русановіч

Сацыялістычная рацыяналізацыя—важнейшы вагар унутрыпрамысловых накапленьняў

У сваёй рэзалюцыі па дакладу тав. **Арджанікідзэ** XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя вызначыла тыя асноўныя задачы, якія прад'яўляюцца зараз да сацыялістычнай рацыяналізацыі.

«Рацыяналізацыя і стандартызацыя вытворчасьці, самая жорсткая эканомія ў расходаваньні матар'ялаў, асабліва дэфіцытных, эканомія мэталю і апалу на адзінку вырабу, шырокае ўкараненьне электра-аўтагеннай зварки, поўнае асваеньне новых тэхналёгічных працэсаў, бязьлітасная барацьба са стратамі...—усё гэта зьяўляецца неабходнымі прадпасылкамі палепшэньня якасных паказальнікаў і росту ўнутрыпрамысловага накапленьня. Гэтыя задачы дыктуюць далейшае разгортваньне працэсу аўладаньня тэхнікай, на аснове ўсё больш шырокага супрацоўніцтва кіруючых дасьледчых установаў з прамысловасьцю...»

XVII партканфэрэнцыя выступила ў якасьці баявога заданьня — задачу поўнага аўладаньня перадавой тэхнікай, заваяваньня тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР.

У гэтай галіне прамысловасьць БССР мае ўжо значныя дасягненьні. Рад прадпрыемстваў дабіліся поўных посьпехаў у асваеньні новых вытворчасьцей у выпрацоўцы абсталяваньня і прыладаў, якія раней увозіліся з-за мескаў.

Завод «Чырвоны мэталіст», напрыклад, пачынае выпрацоўваць пугі Эбергарта для ворыва балотных мясцовасьцей. Там-жа выпрацоўваюцца кормзапарнікі.

Завод Гомсельмаш асвоіў вытворчасьць капюшнласартовак.

Завод імя Варашылава выпускае сьвідравальныя мэханізаваныя варштаты, якія замяняюць імпартныя.

Завод **«Камунар»** выпускае зараз бульбакамбайн, які быў вынайдзен рабочым саўгасу **«Сормаўск»,** Арпінскага рабу тав. **Казлоўскім.**

Адным з буйнейшых вынаходзтваў зьяўляецца пецельная машына (вынаходка рабочага швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн» тав. **Шапіра**), якая замяняе імпартныя машыны.

Сапраўны пераварот у швэйнай прамысловасьці робіць вынаходзтва васьпілачнай машыны (вынаходца — рабочы швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. **Фіш**).

Трэба адзначыць яшчэ пабудову фрэзэрнага варштату да прасоўкі тарфяных плітак, электразакройных машын, бясспасавых перацач на швэйных фабрыках і інш.

У **тарфяной прамысловасьці** шмат што зроблена ў адносінах рацыяналізацыі працэсу варашэньня торфу. Раней на торфаводзе «Давыдаўка», напрыклад, варашэньне фрэзэрнага торфу рабілася ўручную граблямі. Зараз гэта работа мэханізавана, граблі заменены дрыўлянымі боранамі, прымацаванымі да трактару. Гэта мерапрыемства значна палегчыла ўмовы працы і дала эканомію па рабоце ў сэзон кампаніі 7.000 руб.

Збіраньне фрэзэрнага торфу ў валкі (грады) для складаньня ў штабэлі пасьля прасоўкі раней рабілася тарпасьля прыладамі ўручную. Гэты спосаб зараз заменен укараваньнем валказьбіральнікаў. Гэта мерапрыемства правэдзена на 5 заводах і дала эканомію за сэзон у 7.680 руб. пры затрацэ ў 1.500 руб.

У **гарбарнай прамысловасьці,** у прыватнасьці па заводзе «Бальшавік», якасьць прадукцыі, якая ўжываецца на ніжэйшыя ялавачных скур у адной ніжэйшай ялавачных скур у адной ніжэйшай замест язьвіх, шыцтам зьмены складу фарбавачных матар'ялаў. Гэта дало пасьпяховае вытворчага цыклю, эканомію рабілы і фарбавачных матар'ялаў. У 1931 годзе атрымана ад гэтага эканомія ў 19.000 руб.

У **шкляной прамысловасьці,** дзякуючы скарыстаньню адкідаў ляпавага шкла для вырабу шклянак пад крэм і мазь, атрымана ў 1931 г. эканомі толькі па двух заводах на суму 21.000 руб.

Усе гэтыя рацыяналізатарскія прапановы, якія зьяўляюцца вынікам вялізарнага вытворчага ўзьдыму рабочых мас і барацьбы за аўладаньне тэхнікай, значна палепшылі арганізацыю вытворчасьці, але далёка яшчэ ня вычарпалі ўсіх тых вялізарных магчымасьцей, якія закладзены ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы.

У 1931 годзе мы дасягнулі значных перамог у ажыцьцяўленьні рацыяналізатарскіх пляноў. Калі ў 1931 годзе было запраектавана атрымаць эканомію ад рацыяналізацыі 2,665.000 руб., то за першае паўгодзьдзе 1931 году атрымана 2.860.000 руб. Калі ў 1931 годзе па прадпрыемствах ВСНГБ было выдадзена 60 работнікаў па рацыяналізацыі — 32 проц. патрэбнага ліку, то ў 1931 годзе прадавала 126, або 65 проц.

Адпак, ці можам мы ганаваціцца гэтымі вынікамі? Ні ў якім разе.

За 9 месяцаў 1931 году, гадавы рацплян выкананы толькі на 61,8%.

Асабліва дрэнна ажыцьцяўляюць рацыяналізатарскі план прадпрыемствы **торфаб'яднаньня** (на 17 проц. гадавога заданьня). Адстае аб'яднаньне **будматар'ялаў** (гадавы план за 9 месяцаў выкананы на 9,8 проц.).

Слабо працуюць у гэтай галіне прадпрыемствы **Белкталіяб'яднаньня,** якія ажыцьцявілі рацыяналізатарскі план на 48 проц. З мэталапрацоўчых заводаў поўных посьпехаў дабіліся толькі завод **імя Варашылава** —92 проц. і **«Камунар»**—98 проц.

Невыкананьне рацплянаў тлумачыцца тым, што на радзе прадпрыемстваў ня зьмены яшчэ бюракратычныя бесадзкасьні адносіны да рабочых прапаноў, не праведзена рашучая барацьба з абязьлічкамі.

Матар'ялы ВСНГ паказваюць вельмі значны ўзьдзел рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу ў справе рацыяналізацыі — 4,8 проц. усі

Японскія войскі адкрылі гураганны агонь па кітайскіх пазыцыях

НОВЫЯ ЯПОНСКІЯ ДЫВІЗІІ НАКІРАВАНЫ У ШАНХАЙ

ЯПОНЦЫ ПАЛЯЦЬ ЧАПЭІ

ШАНХАЙ, 28. Паведамленні з японскіх і кітайскіх крыніц аб становішчы на фронце па-ранейшаму супярэчлівыя. Японцы сьцьвярджаюць, што яны акупавалі вёску Цьзянван, кітайцы заяўляюць, што японскія атакі па Цьзянвану адбіты кітайскімі войскамі. Вёска Маоцьзяцьзін па-ранейшаму знаходзіцца ў руках кітайскіх войск.

Праводзячы далей тактыку канцэнтрацыі гураганнага артылерыйскага агню па пэўных пунктах, японская артылерыя адкрыла гураганую страляніну па гарматчых установках і пазыцыях кітайскіх часьцей у Чапэі. Японцы паведамляюць аб поўным зруйнаваньні кітайскіх фартоў у Цзеньцзяліне (паміж Усунам і Люхэ).

Учора ў Чапэі пасьля японскай паветранай бамбардыроўкі ўзьніклі першыя пажары, якія пашырыліся на раён у 4 кв. мілі. Мяркуецца, што бамбардыроўка была праведзена з мэтай палегчыць магчымасьць японскім войскам прасунуцца ў Чапэй. У рэзультаце пажараў ёсьць значная колькасьць чалавечых ахвяр. (ТАСС).

Японцы страляюць разрыўнымі кулямі

ШАНХАЙ, 26. Карэспандэнт ТАСС, сумесна з групай замежных карэспандэнтаў паведаў рад шпіталяў, хутка пабудаваных кітайскай грамадзкасьцю і чырвоным крыжам. Усяго адкрыта 34 шпіталі. Зварачае ўвагу добрая арганізацыя справы, якая вядзецца выключна пры дапамозе добраахвотнікаў, галоўным чынам, дзяўчат, прайшоўших кароткатэрміновыя курсы. Дактары, скардзячыся на затрудненьні са снабжэньнем медыкамэнтамі, сьцьвярджаюць, што перад шанхайскімі падзеямі японцы закупілі ў Шанхаі вялізарныя запасы медыкамэнтаў і цяпер кітайцам прыходзіцца выпісваць медыкамэнты з іншых гарадоў. У некаторых шпіталях дактары гаварылі аб тым, што японцы карыстаюцца кулямі «Дум-Дум». Адзін доктар паказаў з мык раны з куляй «Дум-Дум». Большыня перапоўнены. Параненыя з-за адсутнасьці месц ляжаць у калідорах. Вялікі недахват у ложках. Многія школы абернуты ў шпіталі. Улівэрсытэцкія інтэрнаты прадставілі свае ложкі. Жанчыны па ўсім горадзе шыюць бялізну для салдат.

Зварачае на сябе ўвагу баявы настрой параненых салдат 19-ай арміі, якія просяць дактароў выпусьціць іх чым хутчэй са шпіталяў. Хворыя салдаты дыктуюць школьнікам лісты на імя афіцэраў з просьбай забраць іх са шпіталяў, каб даць магчымасьць весьці далей барацьбу. Лісты накіроўваюцца таксама і сваяком, у якіх параненыя салдаты просяць апошніх не турбавацца, бо «яны (салдаты) ваюць з імпэрыялізмам, барацьба з якім павінна працягвацца да канца».

Суп-Цзі--лін — упала Суп-Ян-сэна, якая суправаджала групу карэспандэнтаў, заявіла, што «новы рэвалюцыйны Кітай, наперакор Нанкіну, што ўсё яшчэ стаіць на пазыцыі несупраціўленьня, выйдзе з гэтай барацьбы, якая будзе працягвацца доўгія тыдні».

Посьпехі кітайскіх войск трывожаць імпэрыялістаў

НЬЮ-ЁРК, 26. У тэлеграме з Жэнэвы карэспандэнт «Чыкаго Дэйлі Ньюс» канстатуе: «У кітайцаў усё больш узмацняецца ўражаньне, што ўвага іх арміі знаходзіцца на адноль-кавым узроўні з ваеннай адвагай буйнейшых дзяржаў. Баяцца, што ў рэзультаце гэтага пасьледуе ваеннае разьвіцьцё Кітаю, якое эфэктыўным чынам пакладзе канец існаванню нярэгулярных дагаворэў і прывілей чужаземцаў і створыць у Азіі дзяржаву, роля якое будзе раснаючай.

Член вярхоўнай ваеннай рады—галоўнакамандуючы японскімі сіламі ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 27. Як паведамляюць, Сіракава (японскі генэрал, член вярхоўнай ваеннай рады) будзе назначаны галоўнакамандуючым японскімі сіламі ў Шанхаі, дзе японскае камандаваньне ў бліжэйшым будучым будзе мець 3 дывізіі.

Энтузіязм сярод кітайскіх войск

БЭРЛІН, 26. Карэспандэнт «Кельнішэ цэйтунг» паведамляе з Шанхаю «кітайскія салдаты захоплены посьпехамі 19 кітайскай арміі. Яны зараз лічаць сябе непераможнымі. Захапленьне, якое панує ў даны момант, можна параўнаць толькі з энтузіязмам рэлігійных войнаў. Тысячы рабочых пачуюць на вуліцах. Усе дамы перапоўнены галадаючымі бежанцамі. Гандаль і вулічны рух спынены. Кітай пакуль што хоча міру. Ніхто не жадае вайны. Аднак, пасьля гераічнага супраціўленьня кітайскай арміі і пасьля заваяваных ёю посьпехаў база для мірных перагавораў у параўнаньні са становішчам, якое было тры тыдні таму назад, рэзка змянілася. Чым далей, тым больш пяспрыяючыя будуць пэрспэктывы гэтых перагавораў».

Пасылка новых 5 дывізій у Шанхай

НЬЮ-ЁРК, 27. Вашынгтонскі карэспандэнт «Нью Ёрк Таймс» паведамляе, што паводле вестак з аўтарытэтнай крыніцы, ЯПОНІЯ ДАДАТКОВА ПАСЫЛАЕ Ў ШАНХАЙ 5 ДЫВІЗІЙ. Такім чынам, агульная колькасьць японскіх войск у Шанхаі будзе складаць 100 ТЫС. ЧАЛАВЕК. Паводле слоў карэспандэнта, новая адпраўка японскіх войск сьведчыць аб тым, што набліжаецца буйныя ваенныя апэрацыі, прычым фронт магчыма будзе пашыран.

Польскія гарнякі трымаюцца стойка

БУРЖУАЗНАЯ ПРЭСА Б'ЕТРЫВОГУ

ВАРШАВА, 24. У Дамброўскім і Краканўскім вугальных басэйнах забастоўка ня спыняецца. **Гарнякі салідарна бастуюць далей.** Адбываюцца часта масавыя мітынгі. У некаторых мясцох зноў дайшло да крывавых сутычак з паліцыяй. У **Гродзьцы** паліцыя напала на рабочы мітынг, разганяючы бастуючых гарнякоў гумавымі палкамі і прыкладамі.

Цэнтр увагі — крывавыя падзеі ў **Челядзі.** Вялізарны мітынг бастуючых і **беспрацоўных, якія салідарызуюцца з забастоўкай,** быў растрэлен паліцыяй. Забіты два рабочыя: **Андрэй Бартосяк і Пась.** Шмат параненых. Падзеі ў Челядзі выклікалі магутны выбух абурэньня бастуючых.

Папэчаўскія прафбюракраты падрыхтоўваюць глебу для зрыву забастоўкі. Але ня гледзячы на ўсе іх намаганьні забастоўка з кожным днём абвастраецца. Буржуазная прэса ўсіх колераў і адценьняў б'е трывогу **аб пераходзе кіраўніцтва забастоўкай у рукі камуністаў.**

Прадпрыемцы імкнуцца паліцэйскім тэрорам зламаць фронт бастуючых. Паліцыя не дапускае нікога бліжэй 2 кілямэтраў да капалень.

Купямёты супроць бастуючых

ВАРШАВА, 25. Сярод рабочых расьце абурэньне ў сувязі з расстрэламі гарнякоў у Дамброве і Верхняй Сілезіі Папэсаўцы, **пад нацыскам вялізарнага абурэньня мас,** прымушаны былі зьняць рабочых Варшавы да пяцідзённай забастоўкі ў знак пратэсту супроць расстрэлу гарнякоў.

У Верхняй Сілезіі панаваецца **дух салідарнасьці з гарнякамі.** Паліцэйскі тэрор супроць бастуючых **узмацняецца.** На металюргічным заводзе канцэрну «Гута Покою» ў **Новым Бытоме** звыш тысячы бастуючых рабочых зьявіліся ў машынным аддзяленьне заводу **выдаляць штрэйкбрэхэраў.** Адбылася сутычка з паліцыяй. Паліцыя дала залп у натоўп рабочых. **Адзін рабочы — Антон Кавальскі — забіт.** Лік параненых ня вытлумачан.

Рабочыя правялі вулічную дэманстрацыю ў знаку пратэсту супроць крывавай расправы. У Дамброве ля шпіталю, дзе знаходзяцца целы забітых, зьбіраюцца вялізарныя натоўпы рабочых. Паліцыя **ў баявой гатоўнасьці** патрулюе па вуліцах. Ідуць бесперапынна масавыя вобыскі і арышты (ТАСС).

КАМПАНІЯ ЗА АБВЯШЧЭНЬНЕ „ЧОРНАЙ ЗАБАСТОЎКІ"

ВАРШАВА, 25. Энэргічная барацьба бастуючых дамброўскіх рабочых супроць штрэйкбрэхэраў і далейшае **абвастрэньне** забастоўкі ўсхвалявала прадпрыемцаў. На некаторых прадпрыемствах рабочыя, якія выконваюць не абходныя для захаваньня капальняў работы, пераведзены на **казарменае становішча.** Па сканчэньні работ іх **ня пускаюць за межы прадпрыемства.** У рэзультаце гэтага узмацнілася кампанія за абвяшчэньне «чорнай забастоўкі» (спыненьне ўсіх работ, неабходных для падтрыманьня капальняў у парадку).

Учора ў **Явожне** адбыўся вялікі рабочы мітынг з удзелам 2.500 рабочых, на якім выступілі Марачэўскі і некалькі дэпутатаў сойму, заклікаўшых рабочых да «супакою і вядзеньня барацьбы выключна ў галіне эканамічнай». Мітынг прыняў рэзалюцыю працягваць забастоўку. Сацыял - фашыстскі прафсаюз прабуе садзіць забастоўку салідарнасьці верхня-сілескіх гарнякоў. (ТАСС).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 25 лютага па ўсім Саюзе здабыта 193.314 тон вугалю. 26 лютага па Данбасе здабыта 137.623 тоны вугалю.

МЭТАЛЬ. 26 лютага па ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 15.349 тон чыгуну, 17.270 тон сталі.

АЎТАМАШЫНЫ. 26 лютага маскоўскі аўтазавод імя Сталіна (АМО) выпусьціў 50 аўтамашын.

Сельгасмашыны

23 лютага завод **Гомсельмаш** выпусьціў 33 сілаасарэзкі—143,4 проц. пляну, 17 сячкарань—130,7 проц., 20 бульбасартовак—118 проц. і 8 канюшынасартовак — 228,6 проц. пляну.

24 лютага заводам выпушчана 37 сілаасарэзак—160,2 проц. пляну, 21 сячкарня—161,5 проц. і 20 бульбасартовак—117,6 проц. пляну. Канюшынасартоўкі ў гэты дзень не выпускаліся.

Нявыпуск бульбамыек тлумачыцца адсутнасьцю сырцу.

Стандартныя дамы

За дзьве дэкады лютага **бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат** выпусьціў 54 стандартныя дамы—69,2 проц. месячнага пляну.

Папера

25 лютага **папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» (Чашнікі)** вырабіла 25,967 тоны паперы, або 64,1 проц. пляну. Недавыкапаньне сутачнага заданьня тлумачыцца прастоямі, галоўныя прычыны якіх—рамонты, зьмена адзеньня і недахват пары з-за вільготнасьці торфу.

* * *

24 лютага **папяровая фабрыка «Спартак»** (Шклоў) выпусьціла 23.796 тонаў паперы, або 69,22 проц. заданьня. 25 лютага фабрыкай выпушчана 11,057 тоны паперы, або 45,98 проц. пляну.

Швэйныя вырабы

За пятую пяціднеўку лютага **віцебская швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі»** выканала сваю вытворчую праграму на 85,5%; фабрыка «Прафінтэрн»—на 74,3 проц.

* * *

26 лютага **магілеўская швэйная фабрыка імя Валадарскага** выканала сваю вытворчую праграму на 100 проц.

Скура

За пятую пяціднеўку лютага **магілеўская гарбарня імя Сталіна** вырабіла прадукцыі на 67.581 руб., што складае 100,37 проц. пляну.

* * *

З 21 па 26 лютага **магілеўская рымарна-сядзельная фабрыка** выпусьціла прадукцыі на 85.536 руб.—93,5 проц. пляну. Невыкананьне заданьня тлумачыцца значнай колькасьцю забракаваных хамутоў з-за дрэннай якасьці лямцу, які фабрыка атрымлівае ад менскай лямцавай фабрыкі, а таксама нездавальняючым забесьпячэньнем вяроўкамі і канатам.

Пабудова ткацкага цэху на фабрыцы „Дзьвіна"

Віцебская ІЛЬНАПРАДЗІЛЬНАЯ ФАБРЫКА «ДЗЬВІНА» заканчвае абсталяваньне і мантаж ткацкага цэху, які разьлічан на 63 ткацкія варштаты, з вырабам у зьмену 2.300 мэтраў тканіны. Пуск ткацкага цэху дасьць магчымасьць на месцы скарыстоўваць тую пражу, якая робіцца фабрыкай. Гэта з'эканоміць дзесяткі тысяч рублёў, якія трацяцца на транспартаваньне і ўпакоўку поўфабрыкатаў. 1 сакавіка 1932 г. ткацкі цэх будзе пушчан поўным ходам.

Для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, якія будуць працаваць у ткацкім цэху, адкрыт фабзавуч, які ўжо ўкамплектован вучнямі. (БелТА).

Ст. Віцебск сарвала пагрузку торфу для БелДРЭС

Мабілізацыя ўвагі пралетарскай грамадзкасьці на сваячасовае і поўнае забесьпячэньне БелДРЭС апалам дала значныя вынікі. Зараз БелДРЭС часамі не спраўляецца прымаць патокі тарфяных грузаў, і здараецца, што вагоны з торфам прастойваюць неразгружанымі па 8 і больш гадзін.

Ёсьць ганебныя факты безадказнасьці работнікаў чыгункі. Так, гэтымі днямі БелДРЭС даў заяўку ст. Віцебск на падачу 30 вагонаў на станцыю Копысь для пагрузкі торфу. Дыспэтчар ст. Віцебск абяцаў, што вагоны будуць даны ў паказаны тэрмін.

Для пагрузкі торфу было завербавана 120 рабочых-грузчыкаў, але-ж у вызначаны дзень па паўторнае запытаньне дыспэтчар адказаў, што заяўкі на вагоны ў яго няма. Торф пагружан ня быў, і БелДРЭС прымушана была заплаціць рабочым больш тысячы рублёў. (БЕЛТА).

ВЫПУСК РАЗЬМЕННАЙ НІКЕЛЕВАЙ МАНЭТЫ

Пастанова ЦВК і СНК СССР

МАСКВА. У разьвіцьцё мерапрыемстваў, накіраваных на забесьпячэньне грашовага звароту разьменнай манэтай, **ЦВК і СНК СССР пастанавілі** даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў Саюзу ССР выпусьціць у зварот разьменную **нікелевую манэту** коштам у **дзесяць, пятнаццаць і дваццаць капеек.** Разьменная нікелевая манэта выпускаецца ў зварот і абавязкова да прыёму ў плацяжы наравні са срэбнай манэтай.

Вага і разьмеры манэт устанаўляюцца наступныя: 10 кап. — вага 1,8 грама і дыямэтр — 17,27 міліметра, 15 кап. — вага 2,7 грама і дыямэтр — 19,56 міліметра, 20 кап. — вага 3,6 грама і дыямэтр — 21,84 міліметра.

Папраўкі

У пастанове ЦК КП(б)Б «Аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым укацаваньні калгасаў» («Зьвязда» нумар 46 ад 26 лютага) у апошнім абзацы замест: «Асаблівасьці гэтых раёнаў могуць перашкаджаць арганізацыі брыгад па вытворчым прынцыпе», трэба чытаць: «Асаблівасьці гэтых раёнаў **НЯ** могуць перашкаджаць арганізацыі брыгад па вытворчым прынцыпе».

У «Зьвязьдзе» № 43 ад 21 лютага ў пастанове СНК БССР аб ходзе падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы ў пункце 2 надрукавана: «Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, сельскім саветам, Белкалгасцэнтру і беларускаму аддзяленьню Трактарацэнтру скончыць засыпку насеньня і страхавых фондаў і 100 проц. ачыстку насеньня да 15 сакавіка». Трэба чытаць: «ДА 10 САКАВІКА».

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДЫКТАТУРУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Да рабочых, сялян, працоўнай інтэлігенцыі Заходняй Беларусі

Пятыя ўгодкі з дня разгрому Грамады сустракае Заходняя Беларусь у жорсткай барацьбе з акупацыйнай уладай польскіх панаў і капіталістаў, якіх падтрымлівае ППС, Стронніцтва Хлопскае, беларускія нацыянал-фашысты, як Луцкевічы, Астроўскія, Акінчыцы, Ярэмічы і інш. Да ўзмацненьня гэтай барацьбы заклікаюцца працоўныя масы былымі паслямі Грамады Тарашкевічам і Валошыным, якія гінуць ужо доўгія гады ў турмах панскай Польшчы.

Іх баявы, магутны заклік хоць выяволеных фізычна, але вольных духам, барацьбітоў паказвае шлях для працоўных мас, як скінуць кайданы польскай панскай акупацыі, як вызваліцца з ярма эксплёатацыі і абшарнікаў і акупантаў.

Мы, былыя паслы Грамады, якія вырваліся з рук фашысцкіх катаў і працуем у вольнай краіне Савэтаў, далучаемся да закліку т. т. Тарашкевіча і Валошына і словамі гэтых барацьбітоў-герояў зьвяртаемся да працоўных мас Заходняй Беларусі:

«Няхай вашая штодзённая барацьба дакажа, што чырвоны сьцяг Грамады ня выбіты з рук працоўных мас, што жыве і магутнее справа вызваленьня беларускага народу з пад панска-польскай акупацыі.

Наперад Грамадаўцы. У першыя рады змагаючыхся працоўных мас. Няхай баявыя сьцягі Грамады разьвяваюцца ў клясовых баёх, якія разгараюцца па ўсёй Польшчы ва ўсё большае полымя нязвісьці, адвагі і помсты. Наша перамога набліжаецца, наша перамога немінучая».

Сябры грамадаўцы!

Здрадніцкі беларускага народу Акінчыцы, Луцкевічы і іншая панская сволач хочуць давесьці вам, што мы кінулі краіну, што мы не змагаліся да канца за справу рабочых і працоўнага селянства. Яны гэтым хочуць апраўдаць свае прыслужваньні абшарнікам і акупантам, скрыць сваю ролю дэфэнзыўшчыкаў у справе здрады інтарэсаў беларускага працоўнага народу.

Фашысцкі ўрад, выпускаючы нас з вастрогу, стараўся дэзарганізаваць працоўныя масы, стараўся зламаць нашу рэвалюцыйную волю і ўцягнуць нас у згоду і супрацоўніцтва з акупантамі так як гэта зрабіў Акінчыц.

Але гэта ўраду не ўдалося. Па выхадзе з турмы мы зараз-жа прыступілі да рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялян. За гэта нас, як і Тарашкевіча, урад капіталістаў і абшарнікаў хацеў кінуць зноў за краты. Мы змушаны былі пакінуць край і пераехаць у вольную Савецкую Беларусь. Але гэтым мы не адарваліся ад барацьбы рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Бо жывем вашымі думкамі, бо сочым і салідарызуемся з гераічнай барацьбой рабочых і сялян. Мы, працуючы тут і ўкладваючы свае цаглінкі ў вялізарнае сацыялістычнае будаўніцтва, адначасова дапамагаем вашай барацьбе. Бо дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве ёсьць разам і вашымі дасягненьнямі, бо СССР ёсьць бацькаўшчына прыгнечаных народаў ўсяго сьвету і апорай міжнароднага руху рабочых і сялян.

Сябры! Капіталістычная Польшча перажывае руйнуючы крызіс, зачыняюцца заводы і фабрыкі. Новыя і новыя дзесяткі тысяч рабочых выкідваюцца на вуліцу. Галее і ўшчэнт руйнуецца працоўнае селянства. Урад капіталістаў і абшарнікаў накладвае новыя падаткі, выціскае апошнія сілы з рабочых і сялян, а ўсё гэта ідзе на паліцыю, шпіёў правакатараў, на падрыхтоўку вайны супроць СССР.

У гэты-жа час у Савецкай Беларусі, як і ва ўсім СССР, мы зьяўляемся сьведкамі нябывалых яшчэ ў гісторыі дасягненьняў і пабудовы новага вольнага жыцьця. Беларусь, якая пры царызьме была самай адсталай краінай, цяпер працоўныя масы, пад кіраўніцтвам кампартыі ператвараюць яе ў краіну прамыслова-калгасную. Новыя заводы, фабрыкі, машына-трактарныя станцыі для сельскай гаспадаркі, рост дабрабыту рабочых і сялян, зьнішчэньне беспрацоўя, павышэньне культурнага ўзроўню, зьнішчэньне няпісьменнасьці, буйнае разьвіцьцё беларускай пралетарскай культуры — вось заваяваньні рабочых і сялян, у руках якіх знаходзіцца ўлада.

Мы навочна пераканаліся, што **толькі кампартыя змагаецца да канца і аддана за інтарэсы працоўных мас, што толькі пад яе кіраўніцтвам можна перамагчы ў рэвалюцыі і пераможна будаваць сацыялізм.**

Посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве наводзяць сьмяротны жах на сусьветную буржуазію, у тым ліку і польскую. Вось таму польскія імпэрыялісты, вітаючы нападзі Японіі на Кітай, адначасова точаць зубы супроць Савецкага Саюзу. Японія, захапіўшы Манчжурыю, душачы кітайскую рэвалюцыю, рыхтуе напад на СССР з Усходу.

У любы момант польскія паны могуць напасьці на Савецкі Саюз з Захаду. Заходняя Беларусь зноў ператворыцца ў край руіны, пажараў і ўсіх жудасьцяй вайны.

Рыхтуючыся да вайны, ашалелы фашызм ладзіць карныя экспэдыцыі па вёсках Заходняй Беларусі, расстрэльвае дэманстрацыі рабочых і сялян, катуе ў дэфэнзыўне лепшых барацьбітоў працоўных мас. Але гэтага мала для азьвярэлага панства. **У апошнія часы яны ўвялі ваенна-палявыя суды. Фашысцкі ўрад, урад акупацыі, беспрацоўя і голаду хоча шыбеніцамі затрымаць надыход пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.**

У польскіх фашысцкіх турмах гібеюць паслы Грамады **Тарашкевіч і Валошын,** гібеюць паслы «Змаганьня» — **Гаўрылік, Дварчанін, Вальнец і Крынчык,** туды-ж кінуты на доўгія гады тысячы і тысячы беларускіх, украінскіх, яўрэйскіх, польскіх рабочых і рэвалюцыйных сялян. У хуткім часе пачнецца яшчэ адзін працэс над правадыром Грамады— Тарашкевічам, каб учыніць яшчэ адну жорсткую расправу над барацьбітом за вызваленьне беларускага народу.

Сябры! Памятайце, што **ў гэтай ганебнай, крывавай працы фашызму дапамагаюць ягоныя саюзьнікі і агенты — Луцкевічы, Астроўскія, Ярэмічы і іншыя. Яны ўсямерна садзейнічаюць фашызму ў душэньні нацыянальна-вызваленчай барацьбы, яны ашуканствамі стараюцца адвесьці вашую ўвагу ад рэвалюцыйнай барацьбы, ад абароны СССР.**

Наперакор фашызму і яго дапаможнікам ня спыняецца рост рэвалюцыйнай хвалі на Заходняй Беларусі, павялічваюцца рады барацьбітоў за вызваленьне працоўных мас, узмацняецца напорыстасьць мас у іх вызваленчай барацьбе супроць панскай акупацыі.

Усе эксплёатаваныя і беспрацоўныя горараду і вёскі, усе працоўныя сялянскія масы, усе прыгнечаныя польскім фашызмам, абрабаваныя падаткамі, змучаныя шарваркамі, пазбаўленыя роднай школы — усе гуртуйцеся пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду — камуністычнай партыі і разгортвайце нацыянальна - вызваленчую барацьбу супроць панскай акупацыі, за школу на роднай мове, супроць душэньня рабоча-сялянскай беларускай прэсы, супроць кулацкай камасацыі і ліквідацыі сэрвітутаў, супроць шарварак, штрафаў, падаткаў. Масава ўступайце ў арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху, не дапускайце да разгрому ТБШ, паўсямесна засноўвайце гурткі ТБШ. Масоўкамі, мітынгамі, магутнымі дэманстрацыямі гартуйцеся ў барацьбе, гартуйцеся да рашучых баёў, да канчатковай перамогі над панаваньнем капіталістаў і абшарнікаў.

Далоў падрыхтоўку нападу на СССР! Усе на абарону БССР і ўсяго СССР!

Японія разам з міжнароднымі імпэрыялістамі хоча падзяліць Кітай, задушыць Савецкі Кітай. Выступім усе на абарону кітайскага народу і яго рэвалюцыі!

Ані гроша падаткаў ураду голаду, вайны і шыбеніц!

За фабрыкі, зямлю і ўладу!

Далоў белы тэрор! На барацьбу за вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў!

Далоў нацыянальны ўціск. Няхай жыве права на самавызначэньне Заходняй Беларусі аж да аддзяленьня ад Польшчы!

Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад, створаны пралетарскай рэвалюцыяй у Польшчы!

Былыя паслы БС-Р Грамады:
СЫМОН РАК - МІХАЙЛОЎСКІ,
ПЕТРА МЯТЛА.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАРТЫЙНАЕ ВЫДАВЕЦТВА КНІГАГАНДЛЁВАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА НОВУЮ ЧАСОПІСЬ

„ЗА БОЛЬШЕВИЗМ В ТЕХНИКЕ"

Орган інстытуту тэхнікі і тэхнічнай палітыкі і таварыства тэхнікаў-марксістаў пры Камуністычнай акадэміі.

Выходзіць 12 нумароў у год.

Часопісь ставіць сваёй задачай:

Напрымкрымую барацьбу з усякімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі ў галіне тэхнікі і тэхнічнай палітыкі, сыстэматычнае ўнядрэньне ў пытаньні тэхнікі і тэхнічнай палітыкі марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі шляхам;

а) асьвятленьня дасягненьняў і задач савецкай тэхнікі і цэнтральныя праблем нашай тэхнічнай палітыкі;

б) крытычнага асьвятленьня вузлавых праблем капіталістычнай тэхнікі;

в) марксыцка-ленінскага асьвятленьня пытаньняў гісторыі тэхнікі і гісторыі нашых заводаў;

г) агляду выходзячай тэхнічнай літаратуры;

д) агляды работы органаў падрыхтоўкі тэхнічных кадраў.

Часопісь разьлічана на навуковых работнікаў, гаспадарчыя кадры і студэнцтва.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 год—15 р., 6 м.—7 р. 50 кап.

Цана асобнага нумару 1 руб. 30 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі аддзяленьнямі, магазынамі, упаўнаважанымі КНІГААБ'ЯДНАНЬНЯ, на пошце і лістаносцамі.

Тыраж абмежаваны.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПАЧЫНАЕ ВЫХОДЗІЦЬ ГЭТЫМІ ДНЯМІ

10-ДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ОРГАН ФЭДЭРАЦЫІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ І ГАЛОЎМАСТАЦТВА БССР

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 15 кап. у месяц

Усе матар'ялы і карэспандэнцыі дасылаць на адрас рэдакцыі— Менск, Савецкая, 68, рэдакцыі газэты „Літаратура і Мастацтва"

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых агенцтвах, усіх гарбюро і райбюро саюздруку.

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ ОПТЭ

АПЭР.-Э'С. СЭКТАР ЦС „ОПТЭ" АРГАНІЗУЕ

ПАДАРОЖЖЫ ПА УСІХ РАЁНАХ СССР ПА АБМЕНЕ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ

ПАМІЖ ПРАМЫСЛОВЫМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ, САЎГАСАМІ, НАЛГАСАМІ І МТС

і па вывучэньні сац. будаўніцтва і краязнаўства.

Турыстам прадастаўляецца льготы чыгуначны (водны) праезд, харчаваньне, інтэрнат, культабслугоўваньне.

Запрос даведак ў краявых абласных саветах „ОПТЭ".

Падрабязнасьці ў спэцыяльных праспэктах і даведніках.

Чырвоная Зорка — Выключны замежны фільм КЕНІГСМАРК

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. Каса—ад 12 г. дня — Замежная камэдыя ў 7 част. АПОШНІЯ НАВІНЫ.

ПРАЛЕТАРЫ Каса—ад 12 г. дня — МОНЦІ БЭНКС у камэдыі Сапраўдны джэнтльмэн

СПАРТАК — ДЗІНА ДЗА-ДЗУ драма ў 7 частках.

29-го лютага, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Асьветы скліканецца

КАНФЭРЭНЦЫЯ КАМСОДАУ ШКОЛ,

па пытаньнях:

1. Вынікі працы школ за 1-е паўгодзьдзе па выніках рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе і задачы на 2-е паўгодзьдзе.

2. Аб задачах камсоду школ.

Саклады аб працы школ ФЗС — 7, 2, 20, 33.

3. Бягучыя справы.

Загадчык Гарана Шасланоў.

Даводзіцца да ведама ўсіх членаў камісіі па падрыхтоўцы спажыўцоў цяпла і энэргіі ад Менскай цеплаэлектрацэнтралі,

што першы

ПЛЕНУМ КАМІСІІ

СКЛІКАЕЦЦА

на 10 гадзін раніцы 2 сакавіка г.г. у памяшканьні клюбу гарсавету

з наступным парадкам дня:

1. Становішча работ па будаўніцтве Менскай ЦЭЦ і плян будаўніцтва на 1932 год.

2. Электрычная і цеплавая схэмы Менскай ЦЭЦ па грунце тэхнічнага працэсу Энэргабуду.

3. Плян работ па падрыхтоўцы электрычных спажыўцоў Менскай ЦЭЦ і ход яго выкананьня.

4. Плян работ па падрыхтоўцы цеплавых спажыўцоў Менскай ЦЭЦ і ход яго выкананьня.

Прысутнасьць членаў камісіі і ніжэйпамянёных прадстаўнікоў і прадпрыемстваў абавязкова: ВСНГ, УЭР, гарсавету, Саюзэсельэлектра, Белдзэркабуду, брадзільнага аб'яднаньня Наркамснабу, Наркамгасу, Наркамснабу, Менскай гарадзкой электрычнай станцыі, заводу „Бальшавік", Дзяржпляну, Наркамзему, Скурпрам'яднаньня і Інстытуту прамысловасьці.

1 сакавіка, у 7 гадз. вечара, у залі БАН

адбудзецца

СХОД Т-ва ЭКАНАМІСТАЎ-МАРКСЫСТАЎ

сумесна з цэнтральнай камісіяй па 2-й пяцігодцы.

У парадку дня—даклад тав. Патровіча „Мэтадалёгічныя ўстаноўкі 2-й пяцігодкі ВССР".

Запрашаюцца працаўнікі ўстаноў і інстытутаў БАН.

Праўленьне т-ва.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА „СОЮЗОРГУЧЕТ"

1-га сакавіка, у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Ленінскага кутка Наркампрацы (Чырвонаармейская, 16) арганізуе

МАСАВУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ

па пытаньнях, зьвязаных з увядзеньнем зьдзельшчыны і інш. захочваючых сыстэм аплаты працы вучотных і інш. работнікаў кіруючага апарату.

Кансультацыю будзе праводзіць Загадчык сэктару арганізацыі вучоту Усесаюзнага аб'яднаньня „Союзоргучет" тав. Д. Г. РОЖАНСКІ.

Запрашаюцца кіраўнікі вучотных апаратаў, кіраўнікі спраў, рацыяналізатары, працаўнікі эканомікі працы, прафсаюзныя арганізацыі і ўсе зацікаўленыя асобы.

Пажадана, каб зацікаўленыя ўстановы і асобы папярэдня падрыхтавалі пытаньні і падалі іх у пісьмовай форме не позьней 3-х гадзін дня 1-га сакавіка ў Бел. К-ру „Союзоргучета" (Савецкая, 55).

Белсоюзоргучет.

ПЛЯЧАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае набор на падрыхтоўчыя курсы ў плянавага-эканамічны інстытут.

Заявы падаваць да 5/III—32 г. па адрасе: Універсытэцкі Гарадок, Галоўны карпус, пакой 209.

Дырэкцыя інстытуту.

Гэтымі днямі выходзіць з друку, паступае ў продаж і рассылаецца ўсім падпісчыкам

№ 1-2 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" № 1-2

ЗЬМЕСТ

Передавая—XVII партканфэрэнцыя і XIV зьезд КП(б)Б.

Ю. Братноўскі—Змаганьне супроць нацыянальнага прыгнёту.

М. Лабадаў—Аб аскоўных задачах весьнавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 г.

Борба—Торф спрашаючае зьвяно тэмпаў індустрыялізацыі БССР

Немец, Гурэвіч — Кантрабанда неразбоўшагася трацкізма.

БІБЛІЯГРАФІЯ.

Рехліс, Ільюшын, Борба—Супроць меншавіцтвуючага ідэалізму і механіцызму ў філёзофіі.

МАТАР'ЯЛЫ І ДАКУМАНТЫ.

Рэзалюцыі XIV зьезду КП(б)Б.

Прымаецца падпіска на 1932 г.

Усім гадавым падпісчыкам „Бальшавіка Беларусі" будзе дасланы з 1-га нумару.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ КАМІСІЯ

прапануе

усім чырвоным партызанам, чырвонагвардэйцам і членам сямей загінуўшых чырвоных партызан, якія маюць чырвонагвардэйскія або партызанскія білеты і жывуць у горадзе Менску і яго сельсаветах,

зарэгістравацца.

Тэрмін рэгістрацыі з 1-III па 10-III штодзённа ад 1 гадз. да 4 гадз. і ад 7 гадз. да 10 гадз. вечара, тыя, што ня зьявяцца без уважлівых прычын на перарэгістрацыю, будуць пазбаўлены льгот і будуць лічыцца аўтаматычна выбыўшымі.

Старшыня партыйбюро Менскай камісіі ЯРОШАЎ.

Белжыльтэндарт аб'яднаньне

ПАТРЭБНЫ

на пастаянную працу:

інжынэр-тэхн